КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №14 (59)
◂ 25 ЧЭРВЕНЯ – 1 ЛІПЕНЯ ◂ 2007 Г.

# Новы Час



«АДЗІНОКАГА ВАЎКА» ЗАГНАЛІ Ў КУТ І…

Стар. 14

**ПРА ЎЛАДУ І ЗМЕНУ ЎЛАДЫ**

Ёсць такое паняцце, як моцная дзяржава. Вось Лукашэнка, сцвярджаюць афіцыйныя прапагандысты, стварыў моцную дзяржаву.
А Амерыка — моцная дзяржава?

Стар. 5

**ГУД БАЙ, БЕЛЬГІЯ**

На парламенцкіх выбарах у Бельгіі фармальным пераможцам стала партыя, якая дамагаецца фактычнага падзелу краіны.

Стар. 12

**ЖЫГІМОНТ У ПРАЗЕ**

...Адбылася гэта падзея 16 мая 1422 года.

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**ЮРЫ ХАДЫКА, ПРАФЕСАР, ВЯДОМЫ БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЫК І ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ**

**Аб палітычным стане грамадства і перспектывах яго развіцця**

▸ АД РЭДАКТАРА

# ДАТА 22 ЧЭРВЕНЯ 1941 ГОДА

Аляксей КАРОЛЬ

**Калі мы вызначаліся з фарматам калонкі рэдактара, нам вельмі не хацелася, каб яна прымяркоўвалася да пэўных дат. Але як праміну́ць гэты дзень — 22 чэрвеня? 22 чэрвеня 1941 года.**

Страшная дата. Тры гады запар гэта была дата пачатку вайны ў рамках вайны. Пракляты дзень жудаснай трагедыі, бяды і смерці. І кожны той ваенны год быў даўжэй за век. Выжыць і перамагчы — надзея, малітва мільёнаў чатыры гады запар.

І толькі чацвёртая гадавіна ад пачатку вайны выпала на другі месяц пасля вайны. І дата 22 чэрвеня згубілася ў водбліскак пераможнай даты 9 мая.

Але не забылася. Натуральна, што памяць пра пачатак самай маштабнай, самай цяжкай, самай крывавжэрнай вайны за ўсю гісторыю чалавецтва — у кожнага свая. Індывідуальная, што ідзе ад сям'і, ад блізкага атачэння, ад паўнаты ведаў пра вайну, ад светапогляду і характару... Свая яна і ў кожнай краіны, што была ўцягнутая ў вайну на тым ці іншым баку. Тым больш, што вайна перакроіла і межы краін, і блокі. Былых саюзнікаў надоўга падзяліла новая лінія фронту новай сусветнай, на шчасце для мільёнаў жыхароў планеты, «халоднай вайны». Зусім нядаўна скончылася і гэтая вайна. Дай бог, назаўжды, без пагрозы вайны пякельнай.



Алесь Пушкін. Эпітафія дзеду

Натуральна, мянялася памяць і па часе. Але ёсць у гэтай памяці і нешта агульнае, фундаментальнае, што надае аптымізму і ўмацоўвае ў веры: такое больш не паўторыцца.

66 год — тэрмін дастатковы, каб сцішыліся вострыя боль і пякельная нянавісць. Мая маці, што перажыла акупацыю, успаміналá, як доўгі час яна не магла без уздрыгвання чуць нямецкую мову. А мой апанент па дысертацыі, прысвечанай пасляваеннай акупацыйнай палітыцы саюзнікаў у Германіі, кіеўскі прафесар, інвалід вайны, распавёў мне аднойчы, як ён са сваім берлінскім калегам за чаркай нечакана высветлілі, што ў 1943 годзе юнакамі стаялі адзін насупраць аднаго на адной і той жа вышыні. Выпілі і заспявалі ўкраінскую песню.

Натуральна, што дата, якая ўсё далей адыходзіць у мінулае, усё больш становіцца гістарычнай датай. Памяць пра вайну, яе прычыны, ход і наступствы ўсё больш вызваляецца ад прапагандысцкіх міфаў, ідэалагічных табу і свядомых фальсіфікацый, мэтанакіравана створаных таямніц.

Зусім нядаўна мы даведаліся пра пакт Молатава — Рыбентропа, пра сумесныя парады Чырвонай арміі і вермахта ў Брэсце. Пра падзел зон уплыву з прыцэлам на падзел сусвету. Два таталітарных правадыра, два прэтэндэнта на сусветнае панаванне дамовіліся. Але кожны выношваў свой план на апярэджванне. Гітлер перахітрыў Сталіна, распачаўшы свой бліцкрыг на досвітку 22 чэрвеня. Вось і тлумачэнне сталінскай прастрацыі першых тыдняў вайны. Аднак гэта параза Сталіна абярнулася для яго перамогай не толькі 9 мая, але і ў пэўным сэнсе — у гістарычным кантэксце: пачні Сталін вайну першым, то і кляймо, якім адзначаны Гітлер, дасталася б яму. І, адпаведна, — свой Нюрнберг. А так — Тэгеранская, Ялцінская, Патсдамская канферэнцыі. Сярод лідэраў дэмакратычных краін. Сярод архітэктараў пасляваеннага ўладкавання.

І толькі цяпер аб'ектыўная гістарычная праўда пра вайну і віна за вайну змяшчаецца і на Сталіна, на абодва таталітарных рэжымы. Але калі нямецкі народ перажыў свой шок пасля паразы ў вайне, якая для яго абярнулася перамогай дэмакратыі і высокага дабрабыту, то для народаў былога СССР, прысвоеная Сталіным перамога, аплачаная мільёнамі жыццяў, абярнулася працягам таталітарнага рэжыму, новымі рэпрэсіямі, у тым ліку супраць ваеннапалонных.

Калі нямецкі народ прайшоў праз ачышчальнае пакаянне, праз выплату кампенсацый ахвярам гітлераўскага рэжыму, то ў нас на рэпрэсіі сталінскага рэжыму зноў накідваецца завеса маўчання. Горш: спакваля аднаўляецца ідэалізацыя правадыра. Узводзіцца музейны комплекс пад назвай «Лінія Сталіна». Лінія, якой ніколі не было. На якой ніколі не трымалі абарону на пачатку вайны. «Лінія», якая на самой справе сведчыць пра правал сталінскай перадваеннай палітыкі, калі войскі з умацаванняў былі адведзены ў 1939-м. Новую лінію абароны, дарчы, і не будавалі, бо ваенная дактрына Сталіна якраз была разлічана на наступ, на быстраходныя лёгкія танкі, што пераможным маршам праймчацца па бетонным еўрапейскім дарогам.

Да нас не дайшло асэнсаванне пагроз, што нясе ў сабе таталітарызм. Асэнсаванне, якое прывяло да аб'яднання Еўропы. І мы туды ўпарта не жадаем ісці. Ды, што я кажу — мы. Як заўсёды, не мы, а яны — кіруючая так званая эліта. Але з нашага ціхага маўчання.

І праз 66 год, і праз 166, дзень 22 чэрвеня застанецца датай пачатку падзеі, якая змяніла ход гісторыі. І працягвае ўплываць. Галоўны вектар гэтага ўплыву — да дэмакратыі, да аб'яднання і супрацоўніцтва. Не зразумець гэтага — значыць застацца на ўзбочыне гістарычнага развіцця.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГАРЭЛКУ КАНФІСКАВАЛІ

У Кобрынскім раёне канфіскавана партыя кантрабанднай украінскай гарэлкі на 50 мільёнаў рублёў. Алкагольныя вырабы перавозіў 40-гадовы жыхар Гродна. Ён быў затрыманы непадалёк ад вёскі Камень супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС, Кобрынскага РАУС і міжраённага аддзела ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Брэсцкай вобласці.

У аўтамабілі «Фальксваген-Транспарцёр», якім кіраваў жыхар Гродна, былі знойдзены 1 432 бутэлькі гарэлкі вытворчасці Украіны без беларускіх акцызных марак. Складзены адміністрацыйны пратакол. Праводзіцца праверка.

### ЗАБІЛА МАЛАНКАЙ

У Добрушскім раёне маланкай забіла 38-гадовага мужчыну. Трагедыя адбылася 17 чэрвеня падчас моцнай навальніцы. Нябожчык жыў у вёсцы Леніна і працаваў абходчыкам на чыгуначнай станцыі Цераховка.

### БАЦЬКОЎСКІ НЕДАГЛЯД

Дзевяцімесячная дзяўчынка загінула ў вёсцы Дуброва Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Як паведамілі БелаПАН у раённай пракуратуры, у момант трагедыі, якая адбылася раніцай 15 чэрвеня, дзіця знаходзілася ў пакоі адно. У 10.05 цела дзяўчынкі знайшла бабуля: нейкім чынам дзіця апынулася паміж перагародкамі дна ложачка. Паводле папярэдняй версіі, смерць наступіла ад удушэння. Абставіны здарэння высвятляе пракуратура.

### ПЕРАКУЛІЎСЯ ТРАКТАР

У Лунінецкім раёне ў трактары, які перакуліўся ў арашальны канал, загінуў 41-гадовы майстар-наладчык аднаго з мясцовых прадпрыемстваў.

Жыхар вёскі Міжлессе выехаў на асабістым трактары Т–40 на апрацоўку пасеваў і не вярнуўся дадому. Раніцай 14 чэрвеня трактар, у кабіне якога знаходзілася цела мужчыны, мясцовыя жыхары знайшлі ў канале на адлегласці двух кіламетраў ад вёскі. Паводле папярэдняй версіі, мужчына, вяртаючыся дадому, не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у кювет, перакуліўся ў арашальны канал і загінуў у вадзе.

### НЕЛЕГАЛЬНЫЯ СКУТЭРЫ

У Кобрынскім раёне затрыманы два ўкраінскія школьнікі, якія нелегальна перагналі з тэрыторыі сваёй краіны скутэры.

Вучні 11 класа (абодва жыхары вёскі Высочнае Ратнаўскага раёна Валынскай вобласці) былі затрыманы днём 14 чэрвеня ўчастковым інспектарам міліцыі, супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Кобрынскага РАУС сумесна з вайскоўцамі в/ч 1235 у лясным масіве недалёка ад вёскі Оса пры адпрацоўцы прыгранічнай зоны. Два скутэры, кошт якіх больш чым 2,5 мільёна рублёў, канфіскаваны. Юныя кантрабандысты, якія, паводле папярэдніх звестак, пераганялі тэхніку для рэалізацыі пад заказ, перададзены пінскім памежнікам.

### НЕЛЕГАЛЬНАЯ МІГРАНТЫ

10 грамадзян В'етнама і два — Пакістана былі затрыманыя супрацоўнікамі праваахоўных органаў 15 чэрвеня ў Маладзечанскім раёне.

Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязей УУС Мінаблвыканкама, нелегальных мігрантаў — пяцёра в'етнамцаў і двaix пакістанцаў — перавозілі у аўтамашыне «ДАФ», што належыць Літоўскай транспартнай кампаніі, 26-гадовы жыхар Маладзечна. Аўтамабіль быў спынены на аўтадарозе Мінск — Нарач паблізу вёскі Крыніца. Яшчэ пяцёра грамадзян В'етнама супрацоўнікі праваахоўных органаў выявілі на кватэры затрыманага вадзіцеля.

АДУКАЦЫЯ

## РАЗМЕРКАВАННЕ ЗАХАВАЕЦЦА

**14 чэрвеня Палата прадстаўнікоў прыняла ў другім чытанні закон «Аб вышэйшай адукацыі», які захоўвае абавязковае двухгадовае размеркаванне выпускнікоў, якія атрымалі адукацыю за кошт бюджэту.**



Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў старшыня пастаяннай парламенцкай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Здановіч. «Лічу, што мы зрабілі правільна. Сёння галоўнае для нашых выпускнікоў ВНУ — атрымаць працу», — заўважыў дэпутат. Ён паведаміў, што праблема працаўладкавання актуальная для Беларусі: цяпер у краіне прыблізна 397 тысяч студэнтаў, якія праз некаторы час будуць выпускнікамі. Паводле слоў Здановіча, цяпер каля 5–6 працэнтаў выпускнікоў ВНУ не прыязджаюць на працу па размеркаванні. Нягледзячы на тое, што законам замацавана абавязковае двухгадовае размеркаванне выпускнікоў, якія вучыліся на бюджэтнай аснове, паралельна дзейнічае пастанова Савета міністраў, якая прадугледжвае магчымасць не адпрацоўваць два гады. Падставы для гэтага могуць быць розныя: пачынаючы з хваробы і заканчваючы абраннем на выбарчую пасаду (дэпутатам).

Здановіч зазначыў, што з прыняццем абавязковага размеркавання колькасць тых, хто не прыбыў на месца размеркавання, «скарацілася ў разы». Раней не прыбывалі на месца працы прыкладна 25 працэнтаў выпускнікоў.

Акрамя таго, новы закон устанаўлівае норму, згодна з якой на аднаго выкладчыка павінна прыходзіцца не больш чым 10 студэнтаў дзённай формы навучання. Падобная норма была ўстаноўлена, з аднаго боку, з мэтай захавання колькасці выкладчыцкіх ставак, а з другога боку — даць магчымасць выкладчыкам займацца навуковай дзейнасцю.

Паводле звестак Здановіча, за апошнія шэсць-восем гадоў колькасць студэнтаў ВНУ павялічылася амаль у два разы: з 180 тысяч у канцы ХХ стагоддзя да 397 тысяч у 2006 годзе. Пры гэтым колькасць выкладчыцкага складу ўзрасла толькі на 2 тысячы чалавек, што рэзка павялічыла нагрузку на выкладчыка.

Закон «Аб вышэйшай адукацыі» прадугледжвае таксама новую форму акадэмічнага адпачынку — па фінансавых прычынах у выпадку, калі ў студэнта ўзнікнуць матэрыяльныя цяжкасці пры аплаце вучобы.

У новым законе юрыдычна замацавана двухступеньчатая сістэма вышэйшай адукацыі, якая прадугледжвае падрыхтоўку спецыялістаў (ад чатырох да шасці гадоў у залежнасці ад спецыяльнасці) і магістрантаў (не больш за два гады). Паводле слоў Здановіча, пытанне, якой павінна быць магістратура, выклікала вельмі шмат дыскусій, але пасля абмеркавання, у тым ліку і на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, было вырашана адмовіцца ад двухступеньчатай сістэмы вышэйшай адукацыі ў еўрапейскім варыянце (бакалаўр — магістр), што дзейнічае ў краінах — удзельніцах Балонскага працэсу. «Перавага беларускай сістэмы адукацыі заключаецца ў тым, што маладыя людзі, атрымаўшы дыплом пра вышэйшую адукацыю, могуць распачынаць практычную дзейнасць, няхай і не на самым высокім узроўні», — сказаў старшыня парламенцкай камісіі. Паводле слоў Здановіча, у выпадку прыняцця еўрапейскай сістэмы «ўзнікала б яшчэ адна небяспека: частка маладых спецыялістаў, якія атрымалі дыплом, магла б свабодна эміграваць на Захад». На думку дэпутата, «дзяржава павінна рыхтаваць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй перш за ўсё для сябе».

Акрамя таго, згодна з новым законам, рэктараў прыватных ВНУ будзе прызначаць міністр адукацыі па прадстаўленні заснавальніка. Здановіч патлумачыў, што шукаць кандыдатуру кіраўніка будзе заснавальнік прыватнай ВНУ, але прызначаць — міністр, «каб потым дзяржава магла з міністра і спытаць». Прыватныя ВНУ выдаюць дыпломы дзяржаўнага ўзору, таму зніжэнне ўзроўню якасці адукацыі недапушчальна, указаў парламентарый.

У. Здановіч падкрэсліў, што «прыватныя ВНУ працуюць на тых жа прававых умовах, што і дзяржаўныя». «Яны працуюць у рамках заканадаўства, у рамках таго прыёму абітурыентаў, які вызначаны ліцэнзіяй, як і дзяржаўныя ВНУ», — сказаў старшыня парламенцкай камісіі.

Таксама дэпутат паведаміў, што законапраект забараняе адукацыйную дзейнасць на тэрыторыі Беларусі прадстаўніцтвам ВНУ іншых краін. Дазволена праца толькі для філіялаў ВНУ. Паводле яго слоў, на тэрыторыі краіны могуць працаваць толькі самастойныя ВНУ Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, напрыклад, Беларуска-расійскі універсітэт у Магілёве.

ПРАПАНОВА

## ПРЫБРАЦЬ КІЁСКІ

**Санэпідэмслужба прапаноўвае прыбраць з мінскіх вуліц усе камерцыйныя кіёскі.**

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, галоўны санітарны ўрач сталіцы Фёдар Германовіч, прычынай для гэтага паслужыў нездавальняючы стан прылеглых тэрыторый гандлёвых кіёскаў. На думку галоўнага санітарнага ўрача горада, «парадак заўсёды павінен быць як унутры кіёска, гэтак і звонку, а яго на сённяшні дзень няма».

«Кіёскі маюць права на жыццё пры ўмове выканання ўсіх патрабаванняў. Павінны быць, па меншай меры, павільёны з каналізацыяй, як гэта належыць», — падкрэсліў Германовіч. Да таго ж, на яго думку, кіёскі «псуюць выгляд горада».

Старшыня савета Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання (РГА) «Перспектыва» Анатоль Шумчанка, каментуючы прапанову кіраўніка Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, заявіў: «Мы бачым, што ў наяўнасці спроба знішчэння дробнарознічнай гандлёвай сеткі ў горадзе Мінску. Але ж гэтая форма гандлю добра сябе зарэкамендавала: у кіёску атаварваюцца і міністры, і рабочыя. У 2003 годзе мы ўжо змагаліся за захаванне кіёскаў. Тады іх перанеслі на прыпыначныя пункты, далей ад крамаў». На думку лідэра «Перспектывы», прапанова пра ліквідацыю дробнарознічнай сеткі ў Мінску з'яўляецца вынікам «пратэкцыяніцкай палітыкі ўладаў у дачыненні да буйных гандлёвых прадпрыемстваў».

Шумчанка лічыць, што магчымае рашэнне пра закрыццё кіёскаў можа не толькі насіць эканамічны і сацыяльны характар, але і «закране палітычную частку пытання». На яго думку, мінчане гэтае рашэнне не падтрымаюць. «Рабочы ў заводскім раёне пасля цяжкага працоўнага дня ў кіёску каля прадпрыемства можа набыць цыгарэты, ваду або піва. А куды ён пойдзе, калі ўсё гэта закрыюць, бо ў гэтых раёнах магазіны не на кожным кроку размешчаны?» — задаўся пытаннем Шумчанка.

Ён заявіў, што ў выпадку спробы знішчыць дробнарознічную сетку ў горадзе, «Перспектыва» дасць сваю прававую ацэнку такому рашэнню і пакідае за сабою права дзейнічаць згодна з Канстытуцыяй.

ФЕСТЫВАЛЬ

## ДА «БАСОВІШЧА–2007» ГАТОВЫЯ

**Паводле вынікаў канцэртаў, якія прайшлі ў Мінску 16–17 чэрвеня, сталі вядомыя 10 беларускіх гуртоў, якія возьмуць удзел у фестывалі «Басовішча–2007».**

Гэта сталічныя каманды «PoCтра», «SKA!RB», «Sok», «Termin X», «Unia», «Weeping Twilight», «ZigZag», а таксама «Фляус і Кляйн» (Наваполацк) і «Indra» (Полацк). Дзесяты гурт — «Lilith» (Мінск) — заняў першае месца паводле вынікаў інтэрнэт-галасавання на музычным партале «Тузін гітоў» і стаў удзельнікам «Басовішча» без адборачнага канцэрта.

Усяго на фестываль паступіла прыкладна 50 заявак, з якіх журы адабрала 20 для ўдзелу ў канцэрце «Адборышча».

«Басовішча» («Basowiszcza») — фестываль музыкі маладой Беларусі, які праводзіцца штогод з 1990 года. Арганізатарам выступае Беларускае аб'яднанне студэнтаў (BAS) у Польшчы.

«Басовішча–2007» адбудзецца блізу Гарадка ў Падляскім ваяводстве Польшчы. У адрозненне ад мінулых гадоў, фестываль будзе доўжыцца тры дні, з 19 па 21 ліпеня, што, на думку арганізатараў, дасць магчымасць выступіць большай колькасці гуртоў. Акрамя вядомых беларускіх каманд — «Крама», «N.R.M.», «Neuro Dubel», якія пастаянна выступаюць на «Басовішчы», плануецца запрасіць на фестываль гурты з Польшчы, Украіны, Літвы і Італіі, паведаміў А. Мінчонак.

РАСКОПКІ

# КУРАПАТЫ–2

Ян МАЛЕЕЎСКІ

**У канцы мая стала вядома, што ў некалькіх кіламетрах на поўдзень ад Гомеля, у раёне Чарнігаўскай шашы, ва ўрочышчах Тры слупы і Баркі, вайскоўцамі 52-га батальёна праводзяцца раскопкі на месцы масавых пахаванняў.**



Паколькі месца раскопак зачынена для грамадскасці, і вакол яго выстаўленыя пасты міліцыі, нельга з дакладнасцю сказаць, каго расстрэльвалі ў гэтым прыдарожным лесе. Але ўжо вядома: па другі бок шашы ляжаць рэшткі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Улады гэтыя вывады адмаўляюць. Іх версія: тут пахаваны ахвяры нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У 90-я гады на гэтым месцы праводзілі раскопкі археолагі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея. З апублікаванай імі справаздачы вынікае, што ў пахаваннях у Шчакатоўскім лесе знаходзяцца людзі, расстраляныя сталінскімі катамі ў 1937 годзе. Па-першае, ва ўсіх трох даследаваных магільных ямах, сярод сотняў рэчаў не знойдзена ніводнай, датаванай пазней за 1937 год. Па-другое, знойдзены грабенчык з выдрапаным на ім пералікам «антысавецкіх» артыкулаў крымінальнага кодэкса і датай — жнівень 1937 года. Патрэцяе, расстрэльвалі ў патыліцу, метадам НКУС, вядомым ужо па Курапатах.

Пераважная большасць са знойдзеных у пахаванні куль і патронаў — ад нагана ўзору 1895 года, якi знаходзіўся на ўзбраенні НКУС, Чырвонай арміі ў 20–40 гадах. 16 працэнтаў куль і гільз належыць аўтаматычнаму пісталету «Кольт» узору 1911 года, адзінкавыя асобнікі — пісталету «Маўзер» узору 1898 года (у апошнім выпадку, відаць, хтосьці з высокага начальства дэманстраваў ці то сваю службовую стараннасць, ці то проста расстрэльваў «дзеля ўласнага задавальнення»). Аўтаматычныя пісталеты замежных узораў шырока выкарыстоўваліся камандзірамі Чырвонай Арміі і супрацоўнікамі НКУС да прыняцця на ўзбраенне пісталета ТТ (між іншым, скапіяванага з таго ж «Кольта-Браўнінга» пад патрон «Маўзера»). Аднак і пасля прыняцця ТТ на ўзбраенне ў 1933 годзе, гэты пісталет, з прычыны сваіх некаторых канструктыўных недапрацовак, не выцесніў іншыя сістэмы асабістай зброі. У тым ліку і пры правядзенні «спецмерапрыемстваў». Вядома перапіска супрацоўнікаў НКУС падчас правядзення масавых расстрэлаў пад Катынню, якія прасілі даць ім пісталеты замежных узораў па той прычыне, што ТТ не вытрымлівалі напругі і часта ламаліся.

На жаль, з-за адсутнасці незалежнай экспертызы, з-за сакрэтнасці раскопак, сказаць штосьці дакладнае пра знаходкі 52-га батальёна, пакуль немагчыма. Каб высветліць усё гэта, рэканструяваць з дакладнасцю адну з трагічных падзей мінулага, неабходна стварыць кампетэнтную камісію з прыцягненнем незалежных экспертаў. Менавіта з такой ініцыятывай 6 чэрвеня і звярнуліся да Гомельскай абласной Рады прадстаўнікі шэрагу грамадскіх арганізацый горада. Адказу пакуль няма.

**P.S.:** Матэрыялы раскопак ва ўрочышчах Тры Слупы і Баркі на паўднёвай ускраіне Гомеля будзе вывучаць спецыяльная дзяржаўная камісія пры Гомельскім райвыканкаме. Пра гэта паведаміў 18 чэрвеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Міністэрства абароны Беларусі палкоўнік Віктар Шумскі.

Адказваючы на пытанне БелаПАН, ён зазначыў, што, згодна з загадам міністра абароны ад 9 красавіка 1997 года пра парадак правядзення палявых пошукавых работ, усе парэшткі і спадарожныя знаходкі перадаюцца мясцоваму распарадчаму і выканаўчаму органу. «Цяпер, — паведаміў В. Шумскі, — парэшткі 66 загінулых разам з гільзамі і некалькімі гузікамі, знойдзенымі ваеннымі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна ўпраўлення, перададзены ў Прыбыткоўскі сельскі савет Гомельскага раёна».

Паводле слоў начальніка ўпраўлення, экспертнае заключэнне рыхтуюць не спецыялісты Мінабароны, а спецыяльная камісія пры Гомельскім райвыканкаме, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі пракуратуры, органаў унутраных спраў і музейных установ. «Акрамя таго, да працы камісіі могуць прыцягвацца спецыялісты розных, у тым ліку і экспертных, установ», — сказаў В. Шумскі.

Высновы па матэрыялах раскопак на паўднёвай ускраіне Гомеля зробяць адпаведныя экспертныя арганізацыі. «Што ж да нашых уражанняў, дык агучваць іх я не буду», — падкрэсліў начальнік упраўлення Мінабароны.

Трэба зазначыць, што прадстаўнікі грамадскага аргкамітэта па ўвекавечанні памяці ахвяр сталінізму дабіваюцца прыёму ў старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандра Якабсона па пытанні ідэнтыфікацыі матэрыялаў раскопак ва ўрочышчах Тры Слупы і Баркі, з прычыны таго што існуе версія пра масавыя расстрэлы ў гэтым месцы супрацоўнікамі НКУС ахвяр сталінізму, у тым ліку жыхароў Украіны.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# БЕЗ ПРЭФЕРЭНЦЫЙ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Гэтым тыднем Беларусь панесла цяжкую страту. Прычым ва ўсіх сферах, як маральных, так і матэрыяльных, як апазіцыя, так і ўлада. Хворы можа быць рэанімаваны, але рэанімацыі пакуль не падлягае.**

Першая, і найбольш вялікая страта, — для ўлады. 15 чэрвеня Беларусь афіцыйна ўнесена ў спецпараграф даклада Міжнароднай канферэнцыі працы. А 21 чэрвеня ўступіла ў сілу рашэнне Савета Еўрасаюза пра выключэнне Беларусі з Генеральнай сістэмы прэферэнцый у сувязі з парушэннем правоў працоўных і прафсаюзаў.

Камітэт па прымяненні канвенцый і рэкамендацый МАП заявіў: «Адзначаючы адсутнасць прагрэсу ў галіне правоў на свабоду асацыяцый у Беларусі, камітэт у спецпараграфе выказвае сваю заклапочанасць сітуацыяй у краіне. Камітэт настойліва заклікае беларускі ўрад да неадкладных дзеянняў, каб усе працоўныя і арганізацыі маглі дзейнічаць свабодна і рэгістравацца без папярэдняга дазволу ўладаў».

Камітэт таксама выказаў сваю заклапочанасць наконт падрыхтаванага ўрадам Беларусі законапраекта аб прафсаюзах і рэкамендаваў прывесці артыкулы дакумента ў адпаведнасць з канвенцыямі і рэкамендацыямі МАП.

Менавіта гэта і падлягае рэанімацыі. Калі раптам беларускія ўлады проста праявяць палітычную волю ў выкананні правоў прафсаюзаў у краіне, гэтыя прэферэнцыі могуць быць вернутыя. Але наўрад ці хто спадзяецца, што так яно і адбудзецца. Бо не для таго душылі прафсаюзы, каб потым выклікаць ім «хуткую дапамогу».

Другую страту панесла беларуская апазіцыя, якая раптам пазбавілася яшчэ адной структуры і яшчэ аднаго чалавека, якія маглі б паўплываць на сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі.

Савет ААН па правах чалавека прыняў рашэнне пра скасаванне пасады спецдакладчыкаў па сітуацыі з правамі чалавека для Беларусі і Кубы. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў выніковым дакуменце пра новы механізм назірання за сітуацыяй з правамі чалавека ў свеце, што быў прыняты 18 чэрвеня на 5-й сесіі Савета ААН па правах чалавека ў Жэневе.

Гэты дакумент быў распрацаваны ў адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай асамблеі ААН, згодна з якой замест камісіі па правах чалавека засноўваецца савет. На працягу года мусілі быць перагледжаны і рацыяналізаваны ўсе мандаты, механізмы, функцыі і абавязкі скасаванай камісіі.

Распрацаванае пагадненне прадугледжвае, што назіранне за выкананнем правоў чалавека будзе праводзіцца перыядычна ва ўсіх 192 краінах — сябрах ААН. Дакумент таксама мае на мэце скасаванне мандатаў спецдакладчыкаў па сітуацыі з правамі чалавека для Кубы і Беларусі. Пастаяннае назіранне будзе працягвацца ў Бурундзі, Камбоджы, Паўночнай Карэі, Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, Ліберыі, Бірме, Самалі і Судане.

Так што зараз скаргі ў ААН пісаць практычна бессэнсоўна. Зараз давядзецца спадзявацца выключна на Еўропу і Амерыку. Але, здаецца, што гэта больш уплывовыя на Беларусь арганізацыі і краіны, чым даволі аморфная ААН.

«Уведзеныя Еўрасаюзам візавыя і фінансавыя санкцыі супраць кіраўніцтва Беларусі даюць, хутчэй, не практычны, а псіхалагічны эфект», — такое меркаванне ў інтэрв'ю БелаПАН выказаў надзвычайны і паўнамоцны пасол Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі Браян Бенет.

Ну, хоць гэта і псіхалагічнае ўздзеянне, але ўсё ж такі ўздзеянне? А як уздзейнічала на беларускую ўладу ААН? Будзем шчырымі — ніяк.

Там часам Аляксандр Мілінкевіч вырашыў для сябе фундаментальнае пытанне: дзе робіцца беларуская палітыка: на Захадзе ці на Усходзе. Вырашыў ён яго на карысць Беларусі, і аддаў у Міністэрства юстыцыі Беларусі дакументы на рэгістрацыю рэспубліканскага грамадскага аб'яднання Рух «За Свабоду». «Мы вызначылі пяць галоўных кірункаў нашай дзейнасці — гэта абарона правоў чалавека, пабудова грамадзянскай супольнасці, забеспячэнне незалежнасці і суверэнітэту, правядзенне свабодных і дэмакратычных выбараў, а таксама еўрапейскі вектар развіцця нашага грамадства», — заявіў А. Мілінкевіч.



Што ж, ягоныя словы б да Богу ў вушы. Паглядзім, што з гэтага атрымаецца.

Тым часам, духоўнае змаганне працягваецца. Звыш за 50 тысяч чалавек ва ўсіх прыходах Аб'яднанай царквы хрысціян веры евангельскай (ХВЕ) у Рэспубліцы Беларусь і ў многіх іншых пратэстанцкіх цэрквах удзельнічалі ў посце і малітве за свабоду пропаведзі Евангелля, якія праходзілі з 15 па 17 чэрвеня. Прычынай правядзення малітвы сталі адміністрацыйны штраф і арышт пастара мінскай абшчыны «Ян Прадвеснік» царквы ХВЕ Антонія Бокуна 27 мая і 3–6 чэрвеня.

У інтэрв'ю БелаПАН А. Бокун адзначыў, што падчас паста вернікі адмовіліся ад ежы, а некаторыя і ад пітва, каб звярнуць увагу Бога і грамадства на сітуацыю, што склалася ў Беларусі са свабодай сумлення.

У звароце да цэркваў, які падпісаў епіскап царквы ХВЕ Сяргей Хоміч, гаворыцца: «Будзем маліцца за свабоду пропаведзі Евангелля, за прывядзенне законаў нашай краіны ў адпаведнасць не толькі з зямной канстытуцыяй, але, што нашмат важней, у адпаведнасць з Божай воляй. Будзем маліць Бога пра дараванне і дабраславенне Беларусі. У 2007 годзе спаўняецца 70 год жахлівага вынішчэння ўласнага народа — 1937 год быў самым крывавым годам сталінскіх рэпрэсій. Няхай жа не паўторыцца падобнае!»

Але, бадай, самым нешчаслівым чалавекам гэтага тыдня стаў брат грамадскага актывіста Вячаслава Сіўчыка Кастусь Лукашоў. У судзе Ленінскага раёну Мінска зноў разглядаецца ягоная справа. Слуханні павінны былі прайсці раніцай 19 чэрвеня ў судзе Ленінскага раёна Мінска. Аднак пацярпелы Анатоль Сушчэня знаходзіцца ў камандзіроўцы да 5 ліпеня. Пасяджэнне перанесена на 9 ліпеня.

УВАГА

# ТВОРЧЫ КОНКУРС БАЖ «ВОЛЬНАЕ СЛОВА»

**Паважаныя калегі! Грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя журналістаў» распачаў штогадовы творчы конкурс «Вольнае слова».**

Конкурс праводзіцца з мэтай удасканалення прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў незалежных друкаваных СМІ і інтэрнэт-выданняў, заахвочвання таленавітых журналістаў, стымулявання іх дзейнасці ў адстойванні агульначалавечых каштоўнасцяў, у тым ліку прынцыпаў аб'ектыўнай журналістыкі і свабоды слова.

Прымаць удзел у конкурсе маюць права сябры Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя журналістаў».

Конкурс праводзіцца ў два этапы.

На першым этапе прымаюцца журналісцкія матэрыялы, апублікаваныя з 1 студзеня па 30 чэрвеня 2007 года ўключна. Дасылаць творчыя працы неабходна да 15 ліпеня. Вынікі будуць падведзеныя да канца ліпеня 2007 года.

Другі этап уключае публікацыі з 1 ліпеня да 31 снежня 2007 года. Творчыя працы будуць прымацца да 15 студзеня 2008 года. Пра вынікі будзе абвешчана ў студзені 2008 года.

### Намінацыі конкурсу:

**1. НАЙЛЕПШЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ** (рэпартаж, інфармацыйнае паведамленне — не больш за 3 працы аднаго аўтара).

**Ацэньваецца**:

— арыгінальнасць інфармацыі (інфармацыйны факт, інфармацыйная нагода);

— мясцовая навіна;

— адпаведнасць прынцыпам падачы навін;

— арыгінальнасць загалоўка;

— спосабы дасягнення эфекту прысутнасці (для рэпартажу);

— аўтарскі стыль.

**2. ЛЕПШАЯ АНАЛІТЫЧНАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ** (артыкул дыскусійнага, аналітычнага, інфармуючага, тлумачальнага плану — не больш за 3 працы аднаго аўтара).

**Ацэньваецца:**

— інфармацыйная нагода, грамадская значнасць узнятай праблемы;

— адпаведнасць прынцыпам напісання аналітычнага, дыскусійнага тэксту;

— прапорцыі «прысутнасці» меркаванняў аўтара і экспертаў, доказнасць;

— стыль, спосабы аўтарскай падачы;

— «прывязка» да мясцовых праблем;

— адпаведнасць прынцыпам пабудовы інфармуючага, тлумачальнага тэксту;

— графічнае афармленне матэрыялу (пры інфармацыйнай неабходнасці).

**3. ЛЕПШАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ЖАНРУ Ў ЖУРНАЛІСТЫЦЫ** (нарыс, эсэ, рэцэнзія, фельетон — не больш за 3 матэрыялы аднаго аўтара).

**Ацэньваецца:**

— інфармацыйная нагода, выбар праблемы;

— пераканальнасць, доказальнасць, ступень аўтарскай аргументацыі;

— аўтарскі стыль.

Вынікі творчага конкурсу ў пералічаных намінацыях шляхам тайнага галасавання падвядзе журы ў складзе 8 чалавек з ліку вядомых журналістаў і публіцыстаў. Работы ўдзельнікаў конкурсу будуць ацэньвацца сябрамі журы па пяцібальнай сістэме.

Пераможцам будзе прызнаны аўтар, які набярэ найбольшую суму балаў. У выпадку, калі ў двух ці больш прэтэндэнтаў апынецца аднолькавая колькасць балаў, «лепшага з лепшых» вызначыць паўторнае тайнае галасаванне.

У кожнай з 3-х першых намінацый прапаноўваецца ўручэнне трох грашовых прэмій (1 месца — 300 000 рублёў, 2 месца — 200 000 рублёў, 3 месца — 100 000 рублёў) і памятных прызоў.

**4. НАМІНАЦЫЯ «ПРЫЗНАННЕ КАЛЕГ»** засноўваецца для вопытных супрацоўнікаў незалежных СМІ.

Пераможца ў намінацыі «Прызнанне калег» вызначаецца шляхам інтэрнэт-галасавання на сайце БАЖ і ўзнагароджваецца грашовай прэміяй і спецыяльным падарункам.

**5. НАМІНАЦЫЯ «ДЭБЮТ»** — для маладых і пачынаючых журналістаў, стаж працы якіх (або супрацоўніцтва з рэдакцыяй) не перавышае трох гадоў.

Пераможцу намінацыі «Дэбют» уручаецца заахвочваючая прэмія і ганаровы дыплом БАЖ.

Усе конкурсныя матэрыялы будуць выстаўляцца на сайце арганізацыі для публічнага абмеркавання. У будучым прадугледжваецца іх публікацыя ў нашым карпаратыўным часопісе «АБАЖУР», які рассылаецца ва ўсе незалежныя і дзяржаўныя газеты, прыватныя тэлестудыі і дзяржаўныя абласныя тэлерадыёкампаніі.

**Увага!** На конкурс прымаюцца выразкі публікацый (або іх, якасна зробленыя, копіі), завераныя рэдакцыйнай пячаткай і подпісам. Абавязкова прыкладаюцца электроны варыянт матэрыялу, указваецца дата выхаду публікацыі (на кожным артыкуле). Да ўсяго прыкладзіце кароткія звесткі (не больш за адзін аркуш фармату А4) пра свой творчы шлях (што палічыце патрэбным).

Паважаныя сябры, свае публікацыі вы можаце перадаць у офіс БАЖ асабіста ці выслаць па пошце заказным лістом з пазнакай на канверце «Конкурс».

Наш адрас: 220030, г. Мінск, пл. Свабоды, 17 – 304.

Жадаем вам, калегі, творчага поспеху!

Умовы конкурсу зацверджаны Праўленнем ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» 10 красавіка 2007 года.

СМІ

# БЕЛАРУСЬ — СЯРОД АЎТСАЙДЭРАЎ

**Міжнародная праваабарончая арганізацыя «Freedom House» прадставіла чарговую штогадовую справаздачу пра стан дэмакратыі ў 29 краінах былога камуністычнага лагеру. У гэтым спісе Беларусь мае адзін з найгоршых паказчыкаў.**



У дакуменце аналізуецца адпаведнасць 29 краінаў дэмакратычным стандартам паводле стану выбарчага працэсу, сістэмы цэнтральнай і мясцовай улады, свабоды прэсы, карупцыі, правасуддзя і шэрагу іншых параметраў. Агульны стан дэмакратыі ў краінах ацэньваецца паводле шкалы ад 1 да 7 балаў: індэкс 1 сведчыць пра найвышэйшы стан дэмакратычнага развіцця, а 7 — пра найменшы.

Найлепшы вынік маюць цэнтральнаеўрапейскія краіны, якія ўжо інтэграваліся ці інтэгруюцца ў Еўрапейскі Саюз, — ад 1,82 (Славенія) да 3,29 (Румынія). Аднак у некаторых сярэднееўрапейскіх краінах адзначаецца пагаршэнне стану дэмакратычных працэсаў. Прыкладам, у Венгрыі на зніжэнне індэксу паўплываў палітычны крызіс у верасні. Таксама сёлета горш выглядае сітуацыя ў Польшчы з-за канцэнтрацыі ўлады ў руках двух братоў Качыньскіх — прэзідэнта і прэм'ер-міністра, а таксама з-за спрэчнай палітыкі люстрацыі.

У дакуменце адзначаецца працяг антыдэмакратычных тэндэнцый у большасці краін СНД і на Балканах — у Расіі, Беларусі, Арменіі, Азербайджане, Украіне, Албаніі, Харватыі, Чарнагорыі. Ніякіх зменаў не зафіксавана ў Македоніі, Малдове, Косава і ва ўсіх сярэднеазіяцкіх краінах.

Беларусь мае індэкс — 6,68. Гэта адзін з найгоршых паказчыкаў сярод 29 посткамуністычных краін. Беларусь знаходзіцца ў адным шэрагу з Казахстанам, Туркменістанам і Узбекістанам. У справаздачы адзначаецца, што ў 2006 годзе пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія не былі ні свабоднымі, ні празрыстымі, у Беларусі працягвала ўзмацняцца аўтарытарная ўлада Аляксандра Лукашэнкі, якой цалкам падкантрольныя і палітыка, і эканоміка.

Паводле «Freedom House», у 2006 годзе ў Беларусі таксама ўзмацніўся ціск на сродкі масавай інфармацыі і грамадзянскую супольнасць, працягваўся пераслед прадстаўнікоў апазіцыі.

Аднак упершыню за апошние дзесяцігоддзе індэкс дэмакратыі ў Беларусі крыху вырас: з 6,71 да 6,68. Паляпшэнне адзначаецца ў пункце «Грамадзянская супольнасць». У дакладзе падкрэсліваецца, што, нягледзячы на моцны ціск уладаў на трэці сектар (ліквідацыю арганізацыяў, арышты і зняволенні рэлігійных лідэраў і апазіцыі, адлічэнні з ВНУ студэнтаў), актывісты недзяржаўных арганізацый працягвалі змагацца за пашырэнне дэмакратыі ў краіне. Іх змаганне і палепшыла ўспрыманне міжнароднымі праваабаронцамі дэмакратычных працэсаў у Беларусі.

## ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

**Жыццё штодзень ставіць перад намі пытанні. На адны з іх мы самі знаходзім адказы, з іншымі ж, здараецца, без юрыста не разабрацца. Мы працягваем публікаваць адказы на пытанні. На гэты раз дапамогу аказвае юрыст Аляксандр Мікуліч.**

**— Хачу прывесці з Германіі мабільны тэлефон для жонкі і радыётэлефон у дом. Ці патрэбна плаціць мытны падатак?**

**Бароўскі Р. В., г. Мінск**

— Тэлефоны мытным падаткам не абкладваюцца пры ўмове, што іх кошт і кошт іншых рэчаў, якія ўвозяцца, не перавышае 1000 еўра пры агульнай вазе да 50 кілаграмаў. Пры ўвозе на тэрыторыю РБ бытавых радыётэлефонаў патрабуецца дазвол Дзяржаўнай інспекцыі РБ па электрасувязі (БелДІЭ). Мабільны тэлефон увозіцца без дазволу.

**— Ці з'яўляюцца аб'ектам падаткаабкладання чарнобыльскія выплаты (у прыватнасці, дадатковыя адпачынкі)?**

**Андрэеў В. С. г. Гомель**

Паводле арт. 3 Інструкцыі аб парадку рэалізацыі ўзымання падатку з фізічных асобаў і формаў падатковага ўліку, зацверджанай пастановай Міністэрства па падатках і зборах РБ ад 28.02 2006 года № 33, гэтыя прыбыткі не адносяцца да аб'ектаў падаткаабкладання.

**— Ці патрэбна плаціць падатак з грашовага пераводу, атрыманага ад бацькі з Польшчы?**

**Раманчук С. Р., г. Пінск**

— Грашовы перавод ад блізкіх сваякоў, атрыманы з-за мяжы, падаткам не абкладваецца.

**— Па дамове дарэння я падарыла сваю кватэру ўнучцы, якая абяцала за мной даглядаць, але на працягу двух гадоў яна ў мяне была пару разоў, прытым у стане моцнага алкагольнага ап'янення, пагражала забіць мяне, патрабавала грошы. Што мне рабіць, як скасаваць дамову, як вярнуць кватэру?**

**Вішнеўская І. К., г. Брэст.**

— У адпаведнасці з грамадзянскім кодэксам РБ, дамова дарэння можа быць скасавана ў выпадках, вызначаных арт. 549 ГК РБ, праз суд, калі той, хто атрымаў дарэнне, пасягнуў на ваша жыццё ці наўмысна нанёс вам цялесныя пашкоджанні. Вам неабходна звярнуцца ў міліцыю з заявай пра пагрозу жыццю на ўнучку, пасля — у суд, каб скасаваць дамову.

**— Суседзі па кватэры днём і ноччу гучна ўключаюць музыку, тым самым перашкаджаюць адпачываць. Што рабіць у такі выпадку?**

**Качан Г. А., г. Віцебск.**

— Калі чалавек стварае празмерны шум у сваёй кватэры з 22.00 вечара да 6.00 ранку наўмысна, яго дзеянні могуць разглядвацца як дробнае хуліганства з усімі, згодна заканадаўства, наступствамі.

Аднак, калі чалавек робіць гэта не наўмысна, іншы раз нават не падазрае, што ён камусьці перашкаджае, то ёсць рашэнне Віцебскага аблвыканкама, згодна якому забараняецца парушаць грамадскі парадак гучным крыкам ці спевамі, уключэннем на поўную магутнасць магнітафонаў, радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў і іншым шумам на вуліцах, у грамадскіх месцах, а таксама ў кватэрах, інтэрнатах, гатэлях.

Варта звярнуцца да ўчастковага інспектара міліцыі ці ў домакіраванне са скаргай на суседзяў.

МАНАЛОГ

# ПРА ЎЛАДУ І ЗМЕНУ ЎЛАДЫ

Сяргей НІКАЛЮК, палітолаг

**Ёсць такое паняцце, як моцная дзяржава. Вось Лукашэнка, сцвярджаюць афіцыйныя прапагандысты, стварыў моцную дзяржаву. А Амерыка — моцная дзяржава?**

Ні адзін амерыканскі прэзідэнт не можа даць указанні ні адной фірме. Там сіла дзяржавы вымяраецца іншымі стасункамі, іншымі крытэрыямі. Там сіла дзяржавы — у стварэнні эфектыўных законаў. У тых жа Штатах, каб зарэгістраваць кампанію, неабходна два дні. Вось у чым сіла дзяржавы. У нас для гэтага невядома колькі часу згубіш, ды яшчэ розныя ліцэнзіі будзеш атрымліваць больш за год. Дык у чым жа моц нашай дзяржавы?

Напрошваецца адна выснова: моц нашай дзяржавы заключаецца ў канцэнтрацыі пад сваім кантролем максімальна большага аб'ёму рэсурсаў. Па афіцыйных звестках, на пачатак бягучага года дзяржава забірала ў бюджэт 54 працэнты ВУП. Вось у чым яе сіла. Акрамя таго, потым дзяржава можа сабраць банкіраў і сказаць: «Вазьміце на баланс калгасы». Здаецца, грошы банкіраў, а распараджаецца імі нехта іншы — дзяржава.

У такой пабудове дзяржаўных структур наступае момант, калі тыя ж уладныя структуры губляюць тое, што лічылі сваім галоўным здабыткам, — кантроль над працэсам збору і размеркавання рэсурсаў. Пачынаецца працэс раскрадання.

У Беларусі гэта ўжо назіраецца, пра тое яскрава сведчаць выступы прэзідэнта. Што ж такое ёсць перабудова часоў Савецкага Саюза? Працэс раскрадання. З'яўляюцца алігархі. Хто яны такія? Чыноўная эліта і калячыноўныя дзяльцы, што скралі ў час аслаблення дзяржавы сканцэнтраваныя ёю каштоўнасці. Дзяржава ўступае ў перыяд, калі руйнуюцца пабудаваныя ў свой час інстытуты ўлады. Потым наступае перыяд, калі яна зноў узмацняецца. У Беларусі адбылося тое самае.

Цяпер хтосьці кажа, што Расія вучыцца ў Беларусі. Справа, аднак, у тым, што Беларусь — маленькая краіна, яна збудавана працэй, тут няма вялікіх рэгіёнаў са сваімі інтарэсамі. Таму і перыяд канцэнтрацыі ўлады тут прайшоў хутка. Таму і Лукашэнку ўдалося адбудаваць моцную (у яго разуменні) дзяржаву хутчэй, чым гэта адбылося ў Расіі. У Расіі гэты працэс завяршаецца толькі цяпер.

Ёсць такі тэрмін — рэсурсная дзяржава. Гэта калі ўлада распараджаецца рэсурсамі. Усе мы, усё насельніцтва, разглядаецца ўладамі выключна як працоўны рэсурс. Але гэты рэсурс, у гэтай



сістэме, працуе толькі таму, што яго мабілізуюць. Азнаёмцеся з апошнім пасланнем прэзідэнта народу: трэба людзей мабілізаваць. Чытай: трэба людзей прымусіць гарбаціцца ва ўмовах рынку.

Вось у такой мадэлі моцнай дзяржавы людзей прымушаюць гарбаціцца, але калі сіла прымушэння заканчваецца, пачынаецца раскраданне. У пару сваёй моцы такая дзяржава канцэнтруе рэсурсы, размяркоўвае і асвойвае. Рэсурсы — не капітал. Капітал укладваюць і атрымліваюць аддачу. У нашай сітуацыі асвоеныя рэсурсы спісваюцца.

Давайце паглядзім на сітуацыю ў краіне зараз. У 2001 годзе эканамічны, сацыяльны стан быў больш напружаны, чым зараз. Аднак улада змагла мабілізаваць рэсурсы: павысіць пенсіі, заробкі, іншыя выплаты насельніцтву. Як вынік: пасля выбараў апазіцыя не змагла вывесці людзей на плошчу.

Выбары 2006 года. У Беларусі — стабільнасць. Тым не менш, людзі выйшлі на плошчу. А гэта ўжо сведчанне таго, што сацыяльны ліфт спыніўся, сістэма закасцянела. На плошчу выйшла моладзь, у асноўным студэнты, колькасць якіх у краіне ў апошнія гады вырасла ўдвая. З'явілася шмат новых сучасных прафесій. І куды ім ісці пасля заканчэння ВНУ? У эканоміку, якая будуе аграгарадкі? Ва ўсім свеце студэнцтва выходзіць на вуліцу не ад паніжэння ўзроўню адукацыі, а калі спыняецца сацыяльны ліфт. Сам факт Плошчы сведчыць, што мы ўступілі ў перыяд стабільнасці савецкага ўзору — сацыяльныя працэсы ў грамадстве спыніліся.

Змена ўлады адбываецца тады, калі ўлада сама па сабе развальваецца. Мы жывем у тым грамадстве, дзе не ўлада збудавана грамадствам, а грамадства — уладай. Як сведчанне таму такі прыклад: ніхто не можа сказаць, хто на Захадзе стварыў прадпрымальнікаў, а ў нас — дзяржава. На Беларусі ў аснове ўсяго стаіць улада. І яна перыядычна, калі заканчваюцца рэсурсы, развальваецца. Прыклад таму — распад СССР. Хаця Расія не больш прааходняя, чым Беларусь, аднак напачатку дзевяностых гадоў там сфармавалася ўлада, якая даволі паспяхова выкарыстоўвала дэмакратычныя падыходы.

Тыя змены, якім наканавана адбыцца ў Беларусі, будуць у асноўным вырашацца сіламі ўладнай эліты. Апазіцыя не павінна ўпусціць гэты момант. Трэба разумець, што стадыя ўзмацнення дзяржавы, як і канцэнтрацыя рэсурсаў, скончылася. Канцэнтраваць больш няма чаго. Няма каго дадаткова мабілізоўваць і прымушаць гарбаціцца.

Апошнім часам пачынаецца рыторыка: свае праблемы вырашаем самі. Але ў маленькай Беларусі — адкрытая эканоміка. І Беларусь — не Паўночная Карэя, тут нельга марыць людзей голадам. Тут такое немагчыма. Лукашэнка моцна залежыць, на самой справе, ад грамадскай думкі, настрояў у краіне.

Беларускую мадэль пабудовы дзяржавы я б вызначыў як сацыяльна арыентаваную паліцэйскую дзяржаву. Яе апора: дастаткова моцная сацыяльная палітыка (афіцыйна, каля 50 працэнтаў бюджэту ідзе на сацыяльныя праграмы) і сілавыя структуры ў колькасці 230 тысяч чалавек.

Каб здзяйсняць сацыяльную палітыку, неабходны рэсурсы. Дзе сёння браць дадатковыя рэсурсы? Іх няма. І што далей? Мы будзем назіраць ціск з боку Лукашэнкі на бюракратыю. Таму што мадэль дзяржавы, якую ён збудаваў, — гэта унітарнае прадпрыемства (УП) з адным уладальнікам. Усе астатнія, як Сідорскі і іншыя, — нанятыя працаўнікі. Яны не гаспадары, але глядзяць дзе, што і як прыватызаваць на сваю карысць. Лукашэнка гэта адчувае, і таму самай важнай падзеяй гэтага года можна лічыць прызначэнне сына Віктара ў Савет бяспекі. Яно сведчыць пра перасцярогу кіраўніка дзяржавы. Ён, як уладальнік УП, разумее, што функцыя кантролю за надначаленымі заўсёды важная, а зараз шматкроць узмацнілася, і таму даверыць яе нікому, акрамя ўласнага сына, ён не можа. У першую чаргу, сын павінен кантраляваць бюракратыю. Бюракраты — не такія людзі, як мы. У іх руках рэсурсы, якія яны канцэнтруюць і чакаюць моманту аслаблення ўлады, калі іх можна скрасці.

Крадуць, яшчэ як крадуць! На сайце «СБ» набярыце проста «Зянон Ломаць», і вы знойдзеце пацверджанне майго меркавання. І падобнае раскраданне разваліць дзяржаву.

І таму казаць, што апазіцыя прайграла тыя ці іншыя выбары, з пункту гледжання паліталогіі, не карэктна. Сусветная палітычная практыка сведчыць: уладу не выйграюць, уладу прайграюць. Вось хто яе падбірае — справа іншая.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

# «МЫ ПАДТРЫМЛІВАЕМ ПРАЦЭС ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ»

**«Мы падтрымліваем не асобных прадстаўнікоў апазіцыі, а працэс дэмакратызацыі Беларусі ў цэлым», — паведаміў у інтэрв'ю БелаПАН надзвычайны і паўнамоцны пасол Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Браян Бенет.**



Ён адзначыў, што пасля Кангрэсу дэмакратычных сіл апазіцыя засталася расколатай на некалькі частак, кожная з якіх па-свойму ўяўляе сваю далейшую дзейнасць. «Было б цудоўна, калі б апазіцыя прыйшла да згоды і прадэманстравала адзінства, — сказаў Бенет. — Але, з іншага боку, наяўнасць розных пунктаў гледжання і розных меркаванняў — гэта адна з рысаў дэмакратычнага грамадства».

Дыпламат адзначыў, што ў Вялікабрытаніі апазіцыя, якую называюць «апазіцыя Яе Каралеўскай Вялікасці», прадстаўлена ў парламенце, кантралюе дзейнасць урада і рыхтуецца сама сфарміраваць урад у будучыні. У Беларусі сітуацыя супрацьлеглая. Замест таго, каб дазволіць апазіцыі быць часткай палітычнага працэсу, улады спрабуюць ёй перашкаджаць.

Ён таксама падкрэсліў, што Еўрасаюз працягне аказваць падтрымку «людзям, якія абараняюць правы іншых». «Такіх людзей не павінны саджаць у турму, іх сем'і не павінны пакутаваць, — перакананы дыпламат. — Такіх людзей неабходна падтрымліваць, і мы павінны старацца гэта рабіць».

Праграму партыі Летэрма наўрад ці чытала шмат людзей, аднак галоўны лозунг ведаюць усе — патрэбна дзяржаўная рэформа. Летэрм на палітычным узроўні агучыў папулярны сярод фламандцаў, якія складаюць 60 адсоткаў краіны, лозунг: ва ўсіх праблемах фламандцаў вінавата больш бедная Валонія, якая фінансуецца за іх кошт. Выхад — больш аўтаноміі для Фландрыі. Перш за ўсё, гэта больш кантроль рэгіёнаў за падаткамі, якія тут збіраюцца. Летэрм марыць пра пашырэнне кампетэнцый Фламандыі таксама ў галіне сістэмы аховы здароўя і адукацыі. На думку шматлікіх аналітыкаў, рэалізацыя такога кшталту рэформаў створыць грунт для канчатковага распаду краіны ў будучым. Раней, для даведкі, пад кантроль рэгіянальных адміністрацый ужо перайшлі пытанні транспарту, сельскай гаспадаркі і абароны наваколля.

Не будзем таксама забываць, што акрамя хрысціянскіх дэмакратаў у гэтым рэгіёне дзейнічае ультраправая партыя «Фламандскі блок», якая таксама выступае за незалежнасць радзімы Ціля Уленшпігеля. На выбарах у мінулую нядзелю партыя атрымала 19 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў і не будзе прадстаўлена ў будучым кабінеце толькі таму, што амаль усе левыя і ліберальныя партыі байкатуюць любыя ўрадавыя фармацыі з удзелам ультраправых.

Самы вялікі парадокс у тым, што Іў Летэрм, што называецца, рэнегат. Яго бацька паходзіць з франкамоўнай часткі краіны. Наш герой нарадзіўся і вырас у Валоніі. Потым пераехаў у Фландрыю, дзе зрабіў палітычную кар'еру. Дэ факта Летэрм стаў палітычным хедлайнерам не так даўно, прыблізна з 2003 года, калі яго твар пачаў рэгулярна прысутнічаць у палітычных ток-шоу. Ягоным каньком стала жорсткая крытыка кіруючай у краіне каліцыі сацыялістаў і лібералаў. Урад гэты, дарэчы, праславіўся тым, што легалізаваў эўтаназію, мяккія наркотыкі, шлюбы прадстаўнікоў сексуальных меншасцяў. Паралельна з поспехам Летэрма з шэрагаў палітычных маргіналаў пачала паступова выходзіць і яго партыя хрысціянскіх дэмакратаў. Апісаная з'ява, на думку прэсы, сведчыць пра тое, што Бельгія таксама не пазбегла агульнаеўрапейскай хваробы — ідзе буйны працэс персаналізацыі партый.

Здавалася б, валонскія карані маюць зрабіць з Летэрма вельмі талерантнага і адказнага палітыка, які разумее, што дзяліць Бельгію — значыць рэзаць па жывому. Але ж не! Напярэдадні выбараў у размове з карэспандэнтам французскага *Liberation* ён абвінаваціў валонцаў у «інтэлектуальным недаразвіцці». Пра гэта, на яго думку, сведчыць павальнае нежаданне вывучаць фламандскую мову. Праўда, сам Іў Летэрм вывучыў фламандскую толькі пяць гадоў таму.

Валонская частка насельніцтва Бельгіі без энтузіязму ўспрыняла перамогу хрысціянскіх дэмакратаў. Франкафоны галоўным чынам галасавалі за лібералаў, якія, акрамя Валоніі, перамаглі на выбарах у Брусэлі.

Другой сенсацыяй выбараў стаў поспех «зялёных» з партый *Groen!* (фламандская поўнач) і *Ecolo* (валонскі поўдзень), якіх таксама шмат хто з палітолагаў бачыць у складзе будучага ўраду. Наадварот, галоўнымі лузерамі апошніх выбараў сталі фламандскія сацыялісты, якія на працягу васьмі гадоў уваходзілі з лібераламі ва ўрадавую кааліцыю. Рэйтынг іх падтрымкі скараціўся з 24,7 працэнта, што яны атрымалі на выбарах у 2003 годзе, да 16 працэнтаў. Не лепшыя вынікі ў іх сацыялістычных калегаў на поўдні. Электаральны калапс сацыялістаў па ўсёй краіне даў нагоду папулярнаму выданню *Le soir* абвесціць вынікі выбараў як «сацыялістычнае Ватэрлоо».

Кіраўнік папярэдняга кабінета фламандскі ліберал Гі Фервофштад, як гэта патрабуе закон, ужо папрасіў караля Альберта II прыняць прашэнне пра адстаўку яго ўрада. Фармальная працэдура прыняцця адстаўкі дала старт пачатку перамоваў пра фармат новага кабінета. Працэс абяцае быць доўгім і складаным. У дэпутатаў партыі Іва Летэрма няма большасці. Магчымымі партнёрамі Летэрма лічаць валонскіх хрысціянскіх дэмакратаў, сацыялістаў, а таксама эколагаў.

Між тым, сам будучы кіраўнік ураду паабяцаў, што рэформа, каб элегантна развесці Валонію і Фландрыю, будзе праходзіць выключна ў тым выпадку, калі яго каліцыя атрымае падтрымку дзвюх трацін парламентарыяў. Па-іншаму правесці праект канфедэралізацыі краіны не атрымаецца: фактычна, гэта папраўка да канстытуцыі, якую можна змяніць пры наяўнасці падтрымкі ў дзве трэці дэпутацкага корпусу.

БІЗНЕС-КУЛЬТУРА

# КАНЕЦ КАРПАРАТЫЎНАЙ КАРЭІ

Алег ПЯТРОЎ

**Карэйскія жанчыны, якія адмаўляюцца піць на працоўным месцы, нішчаць карпаратыўную культуру Карэі.**

Усё пачалося ў маі гэтага года, калі Вярхоўны суд Паўднёвай Карэі прызнаў кіраўніцтва адной з кампаній вінаватым у тым, што рэгулярна прымушала сваю супрацоўніцу — 29-гадовага дызайнера — удзельнічаць у карпаратыўных вечарынах, якія з'яўляюцца абавязковай часткай менеджменту па-карэйску. Кампанія была вымушана выплаціць супрацоўніцы 32 000 долараў ЗША за інцыдэнт, які адбыўся ў 2004 годзе.

Ніхто не ведае, адкуль узялася такая традыцыя на карэйскіх прадпрыемствах, аднак два разы на тыдзень кіраўніцтва абавязкова праводзіць алкагольнае паці з удзелам персаналу. У выпадку з нашай гераіняй, канцэпцыя вечарыны была наступнай. Спачатку ўвесь калектыў піў соевую гарэлку пад смажанае парася — нешта кшталту нацыянальнай стравы. Пасля добрай вячэры — піўны раунд. І гэта яшчэ не ўсё. Потым уся кампанія перабіраецца ў суседні караоке-бар, дзе спрабуе нешта спяваць і адначасова выпівае віскі — таксама абавязковая частка рытуалу.

Для чаго гэта ўсё робіцца, цяжка сказаць. Аднак — што праўда, то праўда — ад класавай розні на прадпрыемствах не застаецца і следу. Калі бос і яго падначаленыя разам, амаль ніякія, ідуць па начных вуліцах Сеула, падтрымліваючы адзін аднаго і шукаючы таксі, вучэнне Маркса—Энгельса пра тое, што пралетарыят буржую не брат, пасуе. Наступнага ранку наёмная асоба дэманструе працоўны кураж кіраўніку, які пасля ўчарашняга стаў ёй амаль родзічам.

Справа зайшла настолькі далёка, што абавязковай часткай інтэрв'ю падчас уладкавання на працу з'яўляецца пытанне: ці добра вы можаце піць? Адказ «не», як правіла, значыць, што працоўнага месца вам не відаць. І наадварот.

Аднак у статку кароў ёсць і свае казляня. Яно прадстаўлена цэлай сацыяльнай групай — жанчыны. Ім нават пры ўсім жаданні садзейнічаць працэсу карпаратыўнай салідарнасці, фізічна цяжка вытрымаць патрабаванні да ўдзельнікаў гэткіх застолляў: гарэлка, піва плюс віскі. Трэба дадаць сюды асаблівасці піцця па-карэйску: нягледзячы на жорсткі фармат вечарын, у сярэднім карэйцы спажываць алкаголю менш за еўрапейцаў. Проста еўрапейцы п'юць шмат і доўга, а карэйскай культура піцця патрабуе як мага хутчэй напіцца і звваліцца пад стол.

Сярод бізнес-вумен нават распрацавана нешта кшталту металагіі, як можна пазбегнуць перспектывы стаць алкаголікам. Яны збягаюць з вечарыны, калі бачаць, што шэф, які добра пад мухай, перастаў кантраляваць сітуацыю. Яны тайна выліваюць спіртное пад стол. Яны абіраюць «кавалера» і прапануюць яму давесці сваё рэнаме сапраўднага мужчыны, выпіўшы яшчэ адну шклянку — выпадкова атрымліваецца так, што гэту шклянку павінна была піць жанчына.

Не ведаем, як паводзіла сябе наша гераіня, супрацоўніца адной сеульскай фірмы, якая дамаглася ад кампаніі выплаты кампенсацыі. Аднак аднаго вечара яна заявіла патрону, што больш за два бакалы піва піць не будзе.

«Калі ты не будзеш піць сёння, заўтра ты будзеш звольненай», — паставіў ультыматум гаспадар фірмы. З-за страху апынуцца на вуліцы яна напілася, аднак зранку выразшыла, што больш так працягвацца не можа. Пайшла і падала іск у суд, які, як было ўжо сказана вышэй, прыняў рашэнне на яе карысць.

Гэта пастанова стала быццам знакам для жанчын, якія зараз адыгрываюць усё больш важную ролю ў карэйскім бізнесе, патрабаваць змены старой карпаратыўнай культуры. Адмена прымусовага спажывання алкаголю стала першай задачай жаночага супраціву. Важную ролю адыграў той аспект, што зашмат алкаголю часта вядзе да сексуальнага гвалту. Той жа нашай гераіні бос прапанаваў альтэрнатыву гарэлцы — застацца з ім на ноч.

Здаецца, што адміністрацыя шматлікіх фірмаў сама не супраць рэфармаваць сітуацыю ў гэтай галіне. Металургічная кампанія *«Posco»* пачала праводзіць сярод сваіх супрацоўнікаў галасаванне — ці жадаюць яны застацца на калектыўнай вечарыне. Галасуюць працоўныя, падымаючы ўверх карткі жоўтага або чырвонага колераў. Чырвоны колер — сёння нам варта напіцца. Жоўтая картка — давайце пойдзем дадому.

*Woori Bank*, адзін з самых вялікіх банкаў краіны, увёў наступнае правіла: а 10 гадзіне вечара спецыяльная сірэна папераджае ўдзельнікаў вечарыны, што час ісці да хаты. Адначасова кампанія арганізуе спецыяльны аўтобус, які развозіць персанал па хатах.

Кіраўніцтва кампаній кажа, што стала больш сур'ёзна ставіцца да феномену вечарын, таму што для яе важна мець здаровых супрацоўнікаў. Вялікае спажыванне алкаголю таксама з'яўляецца прычынай падзення прадуктыўнасці.

Тым не менш, паводле Карэйскага фонду вывучэння праблем алкаголю, 90 працэнтаў фірм у Карэі дасюль выкарыстоўваюць алкаголь як сродак кансалідацыі працоўнага калектыву. Тая ж дзяўчына, якая перамагла ў судзе, з яе словаў, дасюль не знайшла працу.

Праўда, і актывісты барацьбы з алкаголем не спяць. Яны прыдумалі новы падступны метад рэформы карпаратыўнай культуры: цяпер удзельнікі антыалкагольнай кампаніі не заклікаюць адмовіцца ад вяселля: «Аднак чаму зноў соевая гарэлка пад смажанае парася? А ці не пайсці нам у італьянскі рэстаран», — агітуюць яны сваіх калегаў. Можа, спрацуе?



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АРНАЛЬДА АТЭГІ



Лідэр забароненай баскскай партыі, палітычнай вітрыны тэрарыстычнай групоўкі ЭТА, Атэгі быў арыштаваны 8 чэрвеня і атрымаў 15 месяцаў зняволення ў турме каля гораду Сан-Себасцьян. Афіцыйная абвінавачанне — «праслаўленне тэрарызму». Маецца на ўвазе выпадак 2003 года, тады Атэгі ўзяў удзел у мерапрыемстве, прысвечаным памяці забітага іспанскімі спецслужбамі баевіка ЭТА, Хасэ Мігуэля Банарана. Атэгі асабіста паклаў вянок на магілу тэрарыста ад свайго імя. Увогуле, лідэру баскскіх нацыяналістаў яшчэ моцна пашанцавала: падчас судовага працэсу пракурор патрабаваў прыгаварыць Атэгі да трох гадоў зняволення. Атэгі не дапамагло нават тое, што апошнім часам ён узяў дыстанцыю ад радыкальнай фракцыі ЭТА і выступаў за прыпыненне баявых вылазак супраць іспанскай дзяржавы. Сябры Атэгі, якія засталіся на свабодзе, ужо прынялі спецыяльную заяву з нагоды яго арышту. Было абвешчана, што арышт Артэгі дэманструе сапраўднае нутро кіруючых краінай сацыялістаў, і паабяцана хутка адпомсціць.

### РАМАН ГЕРТЫХ



Міністр адукацыі Польшчы і лідэр правай кансерватыўнай Лігі польскіх сем'яў зноў апынуўся ў эпіцэнтры скандалу са сваімі новымі ініцыятывамі. Нагадаем, што Раман — фанатычны паслядоўнік Дмоўскага, фюрэра польскіх радыкальных правых 20–30 гадоў.

Раней інтэлігенты амаль зацюкалі Гертыха за ягоныя кансерватыўныя прапановы вярнуць у школу адзіную форму адзення і ўвесці выкладанне рэлігіі ў праграмы, а таксама стварыць аддзел па справах агрэсіўнай моладзі. Яго самая гучная ідэя — распрацаваць механізм «абароны вучняў ад прапаганды гомасексуалістаў», якія пагражаюць «мадэлі сямейнага шлюбу». Ідэя, праўда, не прайшла з-за супраціву паплечнікаў па ўраду, якія палічылі яе занадта эксцэнтрычнай. На гэты раз пан Гертых прапанаваў выключыць з курсу школьнай праграмы творы Гётэ, Дастаеўскага, Кафкі і яшчэ некалькіх пісьменнікаў. Галоўная ідэя Гертыха: вызваліць месца ў падручніках, каб уставіць туды творы Папы Іаана Паўла II і каталіцкіх літаратараў кшталту Яна Дабрачынскага. Паводле Гертыха, вывучэнне іх твораў дапаможа выхаваць падлеткаў сапраўднымі патрыётамі і хрысціянамі.

### СЕЙФ АЛЬ ІСЛАМ



Сын вялікага правадыра лівійскай рэвалюцыі Муамара Кадафі нечакана паабяцаў вызваліць у хуткім часе групу балгарскіх медыкаў, якія зараз знаходзяцца ў турмах Лівіі па падазрэнню ў наўмысным увядзенні ў крoў 486 дзяцей вірусу СНІД. 56 дзетак пазней памерлі. Гісторыя на самой справе вельмі цёмная, паколькі самі медыкі сцвярджаюць, што СНІД трапіў у кроў пацыентаў раней з-за халатнасці лівійскіх дактароў, а іх проста выраішылі зрабіць крайнімі. Як бы ні было, айбалітаў засадзілі ў турму і пачалі судзіць, пагражаючы смяротнай карай. Іншы варыянт — выплаціць ахвярам лячэння па некалькі мільёнаў долараў кожнаму. Натуральна, прынцыпы лівійскага суда далёкія ад еўрапейскіх стандартаў, не кажучы пра тое, што паралельна кожнай сесіі суда праходзілі арганізаваныя ўладамі маніфестацыі супраць дактароў-забойцаў. Еўрасаюз, а пазней нават сам Буш-малодшы падчас візіту ў Балгарыю, патрабавалі ад Трыпалі вызвалення вязняў. Кампраміс быў знойдзены. Вязняў вызваляць, а Еўрасаюз у якасці маральнай кампенсацыі пабудуе ў Бенгазі Цэнтр барацьбы са СНІДам.

▸ МАСТАК І ЎЛАДА

# «АДЗІНОКАГА ВАЎКА» ЗАГНАЛІ Ў КУТ І…

## ЛЁС І ТРАГЕДЫЯ ГЕНРЫХА ЦІХАНОВІЧА

Іна БЕРАЗІНСКАЯ

**У мінскім фальварку «Добрыя мыслі» з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака адбылася выстава.**

Нагадаю: Генрых Ціхановіч нарадзіўся ў сумнапамятным для нашай краіны 1937-м годзе, калі на Беларусі распачыналіся і набіралі моц рэпрэсіі савецкай улады супраць «ворагаў народа». Сярод тых «ворагаў» тады аказаўся і дзед Генрыха — выдатны беларускі драматург і рэжысёр Уладзіслаў Галубок. Пасля арышту У. Галубка яго дачку, актрысу славутай драматычнай трупы, якой кіраваў яе бацька, з трохмесячным сынам выкінулі з так званага Дому спецыяліста, дзе на той час жыла іх вялікая сям'я.

Няхай выбачае мне чытач за гістарычныя падрабязнасці, якіх будзе яшчэ нямала ў гэтым артыкуле. Бо без іх, па майму перакананню, цяжка або зусім немагчыма зразумець некаторыя абставіны жыцця, творчасці і заўчаснай смерці мастака Генрыха Ціхановіча. Хаця кожны з нас у адносінах да гісторыі — мізэрная пясчынка, аднак менавіта гісторыя вяршыць людскія лёсы: кагосьці ўзводзіць на трон, а кагосьці адпраўляе за краты. Але і яна ж кожнаму аддае належнае.

### Частка першая
### Як сістэма ламала людзей

— Мы нічога не маглі даведацца пра лёс Галубка, — казаў у інтэрв'ю газеце «Звязда» ў сярэдзіне 1990-х гадоў Яўген Мікалаевіч Ціхановіч, бацька Генрыха, — пісалі Сталіну, Калініну, аднак ніякіх адказаў не атрымалі. Сакратар партарганізацыі Саюза мастакоў Гаўрыленка параіў мне найхутчэй адмовіцца ад сям'і Галубка, бо інакш, на яго погляд, гэта кепска адаб'ецца і на мне.

А ў Яўгена Ціхановіча была свая ахілесава пята. Аказваецца, падчас вучобы ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме той быў выключаны з камсамолу. Падставай стала тое, што аднойчы на камсамольскім сходзе студэнт выказаўся супраць таго, што ім навязваюць палітагітацыйную работу замест вывучэння анатоміі, работы з натурай. Аднак зяць апальнага Галубка не змалядушнічаў, не парваў з сям'ёй. З наіўнай прастатой ён паўсюль даказваў, што ягоны цесць самаадданы патрыёт, а не шкоднік, нацыяналіст, вораг, як гэта сцвярджаюць энкавэдзісты. Карысці ад такой «адвакацкай дзейнасці» Я. Ціхановіча, вядома, было няшмат, калі не сказаць, што той вельмі рызыкаваў апынуцца таксама за кратамі.



Генрых Ціхановіч. Не ацэнены пры жыцці творца, безумоўна, зойме пачэснае месца ў айчынным выяўленчым мастацтве

Як пазней прыгадваў Яўген Мікалаевіч, несправядлівыя паклёпы на Галубка прымусілі маладога мастака крытычна паглядзець на грамадства, у якім ён жыве. З самаадданай верай у камуністычную партыю, савецкія ідэалы і справядлівасць улады было скончана. Дарэчы, ад сваёй жонкі, Люсі Галубок, Яўген Ціхановіч не адмовіўся ні тады, ні пазней, калі яна злягла ад цяжкай хваробы, даглядаў яе сам да апошняга дня.

Кляймо «нядобранадзейнага», як лічыў Яўген Ціхановіч, на ім паставілі двойчы. Першы раз у 1937 годзе. А другі раз ён атрымаў яго за тое, што быў у Мінску ў час нямецкай акупацыі. Усе мастакі, прынамсі, што апынуліся ў акупацыі, мусілі стаць на ўлік у гарадской управе. Кожны, хто меў «аўсвайс», павінен быў штодня з'яўляцца ў аддзел мастацтва, адзначацца там. Неяк нямецкія ўлады загадалі наладзіць у Мінску выстаўку і кожнаму мастаку прадставіць на ёй па тры творы. Выстава экспанавалася ў некалькіх пакойчыках тэатра оперы і балета. Яўген Ціхановіч не пайшоў на вернісаж. Але немцам спадабаліся яго работы, і тыя запатрабавалі, каб гэты аўтар напісаў для іх партрэты, руіны Мінска. За работу жывапісцу плацілі прадуктамі, дзякуючы якім яго сям'я змагла выжыць у цяжкія гады.

Зразумела, каб не вайна, у час якой Яўген Мікалаевіч аказаўся ў акупацыі ў Мінску, ды не рэпутацыя зяця «ворага народа», усё магло быць зусім інакш у лёсе старэйшага Ціхановіча, а таксама яго сына і ўнука. Як ні стараўся пазней Яўген Мікалаевіч заігрываць з «сістэмай», нават адкрыта прыслужваць ёй: ён удзельнічаў у мастацкім афармленні «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну», пісаў эпічныя палотны пра шчаслівае жыццё ў савецкай краіне, якія хутчэй нагадвалі міфалагічныя сюжэты або казачныя лубкі, выконваў на заказ партрэты правадыроў і кіраўнікоў ураду — улада яму не давярала. Ён быў невыязным, доўгія гады не меў магчымасці зрабіць персанальную выставу, не быў адзначаны званнямі, дзяржаўнымі ўзнагародамі і прэміямі… Між іншым, на сямейнай выставе Ціхановічаў (Яўгена, Валянціна, Генрыха, Яна), якая адбылася ў 2002-м годзе, творчасць Яўгена Мікалаевіча была прадстаўлена ў асноўным партрэтамі і выдатнымі графічнымі работамі. Два яго лепшых жывапісных палатна з серыі «Аб шчаслівай краіне і яе людзях, што жывуць у радасці і дастатку», якія таксама дэманстраваліся тут, давалі яскравае ўражанне пра час, які прымусіў мастака пець дыфірамбы «неіснуючаму раю». Вядома, што дзесяткі аналагічных твораў старэйшага Ціхановіча, якія ўслаўлялі савецкую ўладу, ляжаць у запасніках музеяў. Па ідэі, яны таксама маюць права на жыццё. Больш таго, місію такіх твораў у наш час цяжка пераацаніць, але іх чамусьці не дэманструюць. І дарэмна. Гледачу, я ўпэўнена, было б вельмі цікава.

Дзеля справядлівасці варта сказаць, што ўвесь сацарт Яўгена Ціхановіча, што заляжаўся ў яго майстэрні, у 1990-я гады быў раскуплены замежнымі галерэйшчыкамі.



### Частка другая
### «Маю гонар!»

Маё знаёмства з Генрыхам Ціхановічам адбылося, калі таму не было яшчэ і сарака. Імпазантны, востры на язык, з трубкай, як у «таты Хэма», ён быў сапраўдным прадстаўніком тагачаснай сталічнай творчай багемы. На той час стары Ціхановіч і яго сын дзялілі на дваіх творчую майстэрню. Яўген Мікалаевіч, які сістэматычна прыходзіў працаваць, бывала, бурчэў на нязваных гасцей, што часцяком наведваліся да яго сына. Вядома, працэс творчасці патрабуе адзіноты, засяроджанасці, а тут вядомыя артысты, архітэктары, навукоўцы — дым каромыслам… Стары Ціхановіч не быў сібарытам, і яму зусім не падабалася, калі сын, як яму здавалася, марнуе час на філасофскія гутаркі і анекдоты замест таго, каб займацца мастацтвам, шліфаваць свой прафесіяналізм.

Аднак Генрых на самой справе быў вельмі мэтанакіраваным, цэльным чалавекам. Яшчэ ў інстытуцкія гады ён вельмі карпатліва збіраў звесткі пра сваіх далёкіх продкаў — хацелася адчуваць сябе паўнавартасным чалавекам, які мае свой радавод і свой гонар. Падчас творчых паездак па Беларусі малады чалавек збіраў рэчы традыцыйнай беларускай народнай культуры, прывозіў з экспедыцый прадметы археалогіі, якія сведчылі пра побыт сялян, месцічаў і шляхты… Гэтай калекцыяй ён вельмі ганарыўся, і калі з'яўлялася якая капейчына — набываў старадрукаваныя кнігі.

Але «сябры» з маладых гадоў не забывалі нагадваць, што ён — унук рэпрэсаванага і сын чалавека, які быў у акупацыі. Цень «нядобранадзейнасці» бацькі працягваў цягнуцца і за ім, і гэта нараджала ў душы боль і крыўду. Генрых — свядома ці не свядома — можна сказаць, стараўся апраўдваць свой апалітычны імідж. Да ягонага гонару, мастак ніколі не пісаў на партыйна-гаспадарчыя тэмы, не круціўся вакол улады, не заваёўваў танную славу і аўтарытэт паслухмянасцю і прыстасаванствам. І яшчэ адна важная заўвага: Генрых не хварэў на «тутэйшасць», выдатна ўсведамляючы хто ёсць хто і што ёсць што…

Да адной з рэспубліканскіх выстаў яшчэ ў канцы 1960-х гадоў ён напісаў сваю славутую «Хто з мячом да нас прыйдзе…», якая, канешне ж, не трапіла ў экспазіцыю — вострае цэнзурнае вока ўбачыла ў ёй правобраз «Пагоні», а любыя нацыяналістычныя павевы ўспрымаліся ўладамі надзвычай негатыўна. Пазней Генрых Ціхановіч піша палатно «Янка Купала. 1941 год». Народнага паэта ён паказвае не велічным песняром, а разгубленым бядой чалавекам. Яшчэ адзін варыянт падобнага ж сюжэту зусім сюррэалістычны: маленькая фігурка мастака, за якім следам крочыць гіганцкіх памераў чорная пачвара.

Можна ўявіць, як успрымаліся работы Генрыха Ціхановіча ў 60–70-я гады мінулага стагоддзя, калі адзіным творчым метадам у мастацтве быў сацыялістычны рэалізм. Любы «нефармат», адступленне хоць на крок у бок ад генеральнай лініі камуністычнай партыі лічыліся сур'ёзнай крамолай. Праўда, цяпер ужо за вальнадумства не адпраўлялі за краты. Былі іншыя метады. Творы Яўгена Ціхановіча на «вольныя тэмы» проста не дэманстраваліся на выставах, шырокая публіка не ведала пра яго творчыя экзерсісы. Натуральна, што Генрых, не пазбаўлены творчых амбіцый, пакутаваў ад такой сітуацыі, бо любому творцу, зразумела, патрэбныя, як паветра, прызнанне і любоў гледача. А іх якраз і не было…

Шырокая публіка пазнаёмілася з «нефарматнай» творчасцю Генрыха Ціхановіча ў канцы 80-х — пачатку 90-х мінулага стагоддзя, калі наступіла палітычная адліга. Мастацтвазнаўцы назвалі тады Генрыха Ціхановіча пачынальнікам сюррэалізму ў беларускім мастацтве, журналісты зацікавіліся яго творчасцю. У мастака, натхнёнага ўвагай і перспектывамі,быццам адкрылася другое дыханне. Ён піша сваю славутую «Бітву пад Воршай», якую ў яго адразу набыў Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. Ён піша антываенны цыкл, стварае мноства партрэтаў, пейзажаў, нацюрмортаў… І ў той жа час не прымыкае ні да якіх модных суполак і мастацкіх аб'яднанняў. Ён застаецца верным сабе і сваім прынцыпам.

**Частка трэцяя**

Няспраўджаныя надзеі

Вялікія надзеі сям'я Ціхановічаў ускладала на сваіх дзяцей — сына Яна і дачку Вольгу. Вольга скончыла факультэт мастацтвазнаўства ў Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, а сын паступіў вучыцца на аддзяленне жывапісу Беларускай акадэміі мастацтваў. Генрых Ціхановіч неаднойчы казаў: «Я спадзяюся, што ўсё, што не ўдалося зрабіць у гэтым жыцці мне, зможа ажыццявіць Ян». Але спраўдзіцца гэтым надзеям было не суджана.



Генрых і Яўген Ціхановіч

Яна Ціхановіча адлічылі з акадэміі з трэцяга курса.

— Ні я, ні муж, ні дзед Яўген не пайшлі тады да кіраўніцтва навучальнай установы, каб прасіць за хлопца. Бо ведалі, што адлічылі яго не за кепскія адзнакі і не за кепскія паводзіны, а за грамадзянскую пазіцыю, за тое, што ўдзельнічаў у несанкцыянаваных мітынгах апазіцыі, меў смеласць выказваць сваю пазіцыю, — кажа Ліля Ціхановіч, маці Яна. — Пачуццё годнасці не дазволіла нам гэта зрабіць...

Неўзабаве юнаку прыйшла павестка — там паведамлялася, што восенню яго прызываюць у войска. У Яна не было ніякага жадання служыць у арміі. Юнак марыў стаць мастаком. Калі з'явіўся шанец паехаць у Іспанію, каб працягнуць там навучанне, ён выкарыстаў яго. У замежжы ў беларускага хлопца ўсё быццам бы складвалася някепска. Яго прынялі на трэці курс Барселонскай акадэміі мастацтваў, выкладчыкі адзначалі яго добры мастацкі ўзровень падрыхтоўкі. Хлопец часта пісаў дамоў лісты, у адным з апошніх паведаміў, што эміграцыйныя службы Іспаніі хутка павінны выдаць яму афіцыйны дазвол на пражыванне ў краіне.

Але замест званку з добрай весткай Ціхановічы атрымалі з Барселоны урну з прахам сына, і нейкія недарэчныя тлумачэнні судмедэкспертаў наконт ягонай смерці.

Смерць Яна стала шокам для яго сям'і. Асабліва цяжка перажываў страту сына яго бацька. Здавалася, што ад гора ён нават не можа рэальна ўсвядоміць, што адбылося. Праз нейкі час стаў рыхтаваць пасмяротную выставу малодшага Ціхановіча. Аформіў усе работы, засталася нейкая драбяза. Але ён не дарабіў гэтую справу. Пайшоў у майстэрню — і не вярнуўся дадому.

На выставе, прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння Генрыха Ціхановіча (яе, дарэчы, арганізаваў не Саюз мастакоў, сябрам якога той з'яўляўся, а грамадская галерэя), было прадстаўлена няшмат твораў, але дастаткова, каб зразумець, якога ўзроўню творцу страціла наша мастацтва. Прысутныя там сябры і калегі годна ўшанавалі памяць мастака са знакамітай дынастыі Ціхановічаў. Але ніводная рэспубліканская газета нават не паведаміла пра выставу «першага беларускага сюррэаліста». Хаця і так зразумела, што Генрых Ціхановіч — не герой цяперашняга часу. Па-ранейшаму ў героях патрыярх Савіцкі, які зноў і зноў атрымлівае дзяржаўныя ўзнагароды за заслугі ў мастацтве. Хаця тое, што ён піша цяпер, — гэта ўжо антымастацтва... Але ці варта здзіўляцца? Хіба не зразумела, што кардынальна нічога не змянілася ў нашым з вамі жыцці, і да сапраўднай свабоды і незалежнасці — як да вяршыні Кіліманджара...

Але ёсць надзея, што час усё расставіць па сваіх месцах, і кожны атрымае па заслугах. Імя Генрыха Ціхановіча, які меў, акрамя таленту, яшчэ і моцны маральны стрыжань, уласныя прынцыпы, не сыдзе ў нябыт. Яго час, яго прызнанне і слава — наперадзе. Хаця не выключана, што пра многіх калег Генрыха, якія пры жыцці лічылі сябе ледзь не геніямі, нават не ўспомняць нашчадкі.

P.S.: Як ні парадаксальна, але аптымістычную ноту ў трагічны кантэкст гэтага артыкула ўносіць Ян Ціхановіч. Зразумела, ён паспеў зрабіць зусім мала. Малады чалавек яшчэ толькі вучыўся, а таму яго творчасць падобная на ўзмах крыла смяротна параненай птушкі. Але тым не менш недапетая песня Яна Ціхановіча сімвалічна завяршыла XX стагоддзе. Самой сваёй недарэчнай смерцю ён прымушае нас задумацца пра вялікае прызнанне мастака, пра шкоду сумнеўных догмаў і каштоўнасцяў.

**БЕЛАРУСЬ–ЧЭХІЯ**

# ЖЫГІМОНТ У ПРАЗЕ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Амаль незаўважанай прайшла ў Беларусі адна вельмі важная дата айчыннай гісторыі — 585-я ўгодкі з таго дня, як пляменнік вялікага князя літоўскага Вітаўта, князь Жыгімонт Карыбутавіч (Дзмітрыевіч) са сваім пяцітысячным войскам уступіў у Прагу на дапамогу чэшскім гусітам. Адбылася гэта падзея 16 мая 1422 года.**



Эцюд Анатоля Крывенкі да карціны Ян Жыжка і і Жыгімонт Карыбутавіч»

Але беларусы шануюць гэтую незабыўную старонку беларуска-чэшскіх дачыненняў. Высілкамі культурна-асветнага клуба «Спадчына» ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі прайшла памятная вечарына, прысвечаная гэтай знамянальнай даце. Як падкрэсліў старшыня клуба «Спадчына» Анатоль Яўхімавіч Белы ва ўступным слове: «Пасля паразы крыжакоў, якую нанеслі войскі Кароны і ВКЛ пад Грунвальдам (1410), пляменнік Вітаўта, князь Жыгімонт Карыбутавіч у 1422 годзе ўрываецца ў Чэхію і нагалаву разбівае войскі імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі Жыгімонта І Люксембургскага. Цяжка сабе ўявіць такую сітуацыю: на працягу дзесятка гадоў двойчы была нанесена цяжкая параза для Германіі! У той час гаспадар ВКЛ Вітаўт стаў важнейшым палітычным дзеячам на кантыненце. Цяпер мы як бы «імкнёмся ў Еўропу», а тады мы самі былі чыннікамі еўрапейскай палітыкі! Вось што значаць тыя далёкія падзеі для сучаснай Беларусі!»

Гэтыя высновы былі пацверджаны і ў дакладзе доктара гістарычных навук, прафесара Грыцкевіча. Анатоль Пятровіч распавёў пра першыя зафіксаваныя факты беларуска-чэшскіх сувязяў, калі каралева Ядвіга ў 1397 годзе выдала ўказ пра стварэнне ў Празе Літоўскай калоніі для студэнтаў Вялікага княства Літоўскага, нагадаў пра наведванне ў 1413–1414 гадах Вільні і Віцебска Еранімам Пражскім — рэлігійным рэфарматарам, паплечнікам Яна Гуса.

Вялікая ўвага прысутных была засяроджана на гераічных старонках нацыянальна-вызвольнай барацьбы пад кіраўніцтвам Яна Гуса супраць нямецкага панавання і караля Жыгімонта І Люксембургскага. Была таксама дадзена характарыстыка гусіцкага руху. Спадчынаўцы даведаліся, якія ідэалагічныя разыходжанні мелі чашнікі і табарыты, што складалі аснову руху гусітаў. У гэтых гістарычных варунках, калі пачалося гусіцкае паўстанне, і ў 1421 годзе чэшскі сойм пазбавіў трона Жыгімонта І Люксембургскага, чашнікі прапанавалі чэшскую карону Вітаўту Вялікаму. Але Вітаўт накіраваў у Чэхію Жыгімонта Карыбутавіча.

Чаму Вітаўт адмовіўся сам ехаць у Чэхію, а накіраваў свайго пляменніка? На гэта пытанне адказаў Анатоль Грыцкевіч: «У Вітаўта ў сваёй краіне было шмат клопатаў: і крыжакі, і татары з поўдня, і Маскоўскую дзяржаву трэба было падтрымліваць (у той час дачка Вітаўта Соф'я пабралася шлюбам з маскоўскім вялікім князем Васілём І), трэба было таксама абараняць васальныя Цвярское і Разанскае княствы і Вялікі Ноўгарад. Не давала спакою і ўнутраная апазіцыя ў асобе князя Свідрыгайлы. Таму пакідаць свае ўладаранні ён не мог. Вітаўт вырашыў накіраваць свайго стрыечнага пляменніка, удзельніка Грунвальдскай бітвы князя Жыгімонта Карыбутавіча».



Гісторыкі В. Чаропка і А. Грыцкевіч абмяркоўваюць акалічнасці «чэшскай адысеі» князя Жыгімонта Карыбутавіча

Думкамі на конт таемных спружын палітыкі Вітаўта падзяліўся з прысутнымі вядомы беларускім гісторык і пісьменнік Вітаўт Чаропка. У супольнай дыскусіі былі пакладзены пачатак высвятлення многіх абставін драматычнага і ў многім малавывучанага факту знаходжання Жыгімонта Карыбутавіча на чэшскай зямлі. Адзначалася, што ліцвінскі князь вёў самастойную палітыку ў Чэхіі, але яго неабачлівыя дзеянні прывялі да таго, што ў пачатку 1423 года князь са сваім войскам быў вымушаны вярнуцца на радзіму, у Вялікае княства Літоўскае.

Тым не менш, гэтыя падзеі засведчылі векавыя традыцыі палітычнага і вайсковага ўзаемадзеяння нашых славянскіх народаў супраць вонкавых агрэсараў. Вынікі супольнай барацьбы пасля прывялі да ідэі чэшска-беларускай дзяржаўнай уніі. Няхай гэтаму праекту не было наканавана рэалізавацца, затое супольная барацьба надала новы імпульс для ўзаемадзеяння і ўзаемадапамогі паміж нашымі народамі.

Трэба адзначыць, што свой унёсак у візуалізацыю тагачасных падзеяў унеслі мастакі-сябры клуба «Спадчына». Мастак Анатоль Крывенка прадставіў удзельнікам вечарыны эцюд да сваёй будучай карціны «Ян Жыжка і Жыгімонт Карыбутавіч», а Генадзь Матусевіч прэзентаваў музею гатовы партрэт Жыгімонта Карыбутавіча. Вядомы беларускі рок-музыка і бард Андрэй Плясанаў выканаў музычную інтэрпрэтацыю тых гістарычных падзеяў — гістарычную вайсковую песню «Выправа». Ён жа праспяваў шэраг кампазіцый са сваіх папярэдніх альбомаў.

Няхай сабе і так, але памяць пра «залаты век» у беларуска-чэшскіх адносінах жыве ў нашых сэрцах.

▸ ДЫЗАЙН

# ПАДШЫВАНЦЫ ВАЛЁНКАЎ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Валёнкі — самы паліткарэктны абутак: яны ні правыя, ні левыя, яны бываюць чорныя і белыя. 8 чэрвеня больш за 20 крэатыўных людзей Беларусі дапоўнілі колеравую гаму айчынных валёнак новымі адценнямі: у рамах акцыі *Atlant-M Fashion Night* адбылося моднае шоу «Валёнкі як арт-аб'ект».**

*Fashion Night* ад аўтамабільнага холдынгу *«Atlant-M»* — традыцыйная імпрэза, якая мела месца ўжо двойчы. Але калі папярэднія «ночы» абмяжоўваліся паказамі модных калекцый, трэцяя спроба сталася больш крэатыўнай. Прыкладна як выхавацелькі ў дзіцячых садках раздаюць дзеткам шаблончыкі для расфарбоўкі, а потым ладзяць выставу для замілаваных бацькоў, арганізатары *Fashion Night* прапанавалі розным творцам абраць сабе пару сцілавіцкіх валёнак і зрабіць з ёй усё, што прыйдзе да галавы. У выніку з запрошаных 40 чалавек адгукнуліся і ўзяліся за працу 24. «Валёнкі-шоу» атрымалася яркай падзеяй, якая сабрала ў адзін час і ў адным месцы вяршкі сталічнай багемы — пасяховых мастакоў, мадэльераў і дызайнераў.



Мадэльерны складнік праявіўся на *Fashion Night* у камбінацыі валёнак з іншымі элементамі абутку і вопраткі. Чаканы ход — валёнкі на абцасах (мастак Павел Асмакоўскі), крыху менш чаканы — валёнкі на «бліскавіцах» (мастак-мадэльер Алена Коршак) значна менш чаканы — ажурныя валёнкі на панчошным поясе (дызайнер Дзмітры Сурскі) і зусім нечаканы, але ў дошку просты — валёнкі на падцяжках (рэкламіст Андрэй Халецкі). Мастацкі складнік адбыўся на непаўторнай творчай атмасферы вечара, дзякуючы якой нават самыя прыземленыя людзі хапалі валёнкі, што кепска ляжалі, і проста на месцы пачыналі іх творча асэнсоўваць. Дызайнерскі складнік адбыўся на паказе такім чынам, што не ва ўсіх валёнках лёгка было хадзіць. Некаторыя манекеншчыцы Нацыянальнай школы прыгажосці, дзе ўсё і адбывалася, мелі ці не самае складанае дэфіле ў сваёй практыцы.



Поруч з Манголіяй і Расіяй, Беларусь — адна з трох у свеце краін-вытворцаў валёнак, аднак гэты практычны абутак аўна не цягне на элемент нашага нацыянальнага каларыту. Прынамсі, некаторыя аўтары, свядома ці мімаволі, працавалі з рускім культурным кантэкстам. Знакаміты дызайнер Уладзімір Цеслер мінімалістычна падкаваў дарчаную яму пару, і тая была прадстаўленая на нагах мадэлькі-«блыхі», якую выносіў на руках Ляўша. Мастак Вася Пачыцкі, абвешчаны у канферансе як «перадусім панк-музыка», аздобіў валёнкі выявамі Сяргея Ясеніна — кіч-прывітаннем з познесавецкіх кватэраў працоўнай інтэлігенцыі. Але хуліганскі парыў Пачыцкага, здавалася, падмацаваны нядаўнім поспехам расійскага тэлесерыялу пра Ясеніна, застаўся непрачытаным: нягледзячы на тое, што хлопец-мадэль у «ясенінскіх» валёнках быў максімальна падобны да «апошняга паэта вёскі», ён увайшоў у прэс-справаздачы як «хлопчык, які абліваў публіку шампанскім». Увогуле, кіно было адной з дамінуючых крыніц натхнення для фэшн-валяльнікаў. Некаторыя стылізацыі ляжалі на паверхні і выклікалі ў вачах бамонду радаснае пазнаванне — гаворка перадусім пра валёнкі а-ля «Піраты Карыбскага мора» (аўтарка — Лаліта Угуран, кансультант па іміджы мадэльнай агенцыі *«Serge»*) і валёнкі Чалавека-Павука (аўтар — мадэльер Іван Айплатаў, куратар праекту *Atlant-M Fashion Night*). Іншыя кінаасацыяцыі патрабавалі лікбезу — сакавітыя, аздобленыя клубніцамі і бананамі валёнкі-марыянеткі ад Максіма Осіпава (дызайнер рэкламнай агенцыі *«Hepta Group»*) мелі на мэце нагадаць нам пра феерычны карнавал у Бразіліі. Як патлумачыў аўтар, стыль ён пазычыў ад забытай бразільскай акторкі 1940-х гадоў Кармэн Міранды, якая ў свой час увяла моду на аксесуары са штучных фруктаў.

Відовішча шмат у чым залежала ад артыстычнасці мадэляў — менавіта таму многія дызайнеры спынілі свой выбар на культавых персонах. На подыум выходзіла Ганна (Нюся) Чыстасердава — вядомая ў асяродку мінскай багемы дырэктарка арт-хаўз галерэі «Падземка» — каму, як не ёй, было дэманстраваць ружовыя валёнкі ад Аляксея (Хатсана) Хацкевіча? З іншай культавай персонай звязаны доўгачаканы «нацыянальны каларыт», пра нястачу якога вялося вышэй. Паказ скончыўся дэманстрацыяй валёнак у стылі «За свабоду!» — іх у кампаніі паўголых прыгажунь прэзентаваў фронтмэн гурту «Нейра Дзюбель», рок-ідал Аляксандр Кулінковіч. Увесь перабінтаваны, з перакошаным тварам, у валёнках, абвешаных бел-чырвона-белымі анучачкамі, пад уласную песню, ён увасабляў ці то пакуты творчасці аўтаркі — рэжысёркі рэкламы Юліі Ляшкевіч, ці то пакуты занядбанага роднага краю, ці то пакуты ўсіх прысутных ад браку кандыцыянераў, ці то нейкія абагульненыя, метафізічныя пакуты... Дарэчы, пра пакуты: па чутках, чырвоны колер на стужках быў нічым іншым, як крывёю з вены Юліі Ляшкевіч.

Такім чынам, асноўным прыёмам ці не ва ўсіх мастакоў сталася спалучэнне нардычнага, народнага абутку з кантрастнымі і па магчымасці нечаканымі тэмамі. «Нечаканасці» гэтыя былі самыя розныя: валёнкі + плюшавыя цацкі, валёнкі + карункі, гламурныя валёнкі, ды-джэй-валёнкі, валёнкі на нагах кікбаксёра... Самымі тэхнічна складанымі былі прарошчаныя жывой травой і рамонкамі валёнкі дызайнеркі Алены Цакаленка — побач з імі, ясная рэч, жухлі валёнкі са штучнымі кветкамі ад мастака Руслана Вашкевіча. На гэтым «гібрыдным» фоне арыгінальна, у духу сучаснай філасофіі выглядала дэструкцыя валёнку ад фотамастака Андрэя Шчукіна: на подыум вынеслі ворах лямцу. А самы непаўторны паказ зладзіла рэжысёрка лялечнага тэатру, вакалістка «фрык-кабарэ» *«Серебряная свадьба»* Святлана (Бенька) Бень, вядомая ў сувязі з фэшн-найт як тая, хто «ўлазіць дзвюма нагамі ў адзін валёнак». Бенька разгарнула на подыуме міні-спектакль: у ейным доміку-валёнку пасяліліся дзіцячыя чаравічкі, з якімі адбывалася ціхая, кранальная, вяртаючая ў дзяцінства гісторыя. Бенька была безумоўнай фаварыткай вечара, тым больш што скончыўся ён як заўжды відовішчным канцэртам *«Серебряной свадьбы»*.

...Слова «валёнак» у розных склонах сустракаецца ў гэтым тэксце 41 раз. У любым іншым тэксце гэта было б стылістычнай катастрофаю, але іншы спосаб апісаць словамі атмасферу Atlant-M *Fashion Night* прыдумаць цяжка: пад ранак, засынаючы, аўтарка гэтых радкоў бачыла валёнкі, што плывуць перад вачыма...

## Дзмітры Сурскі: «Бракавала скульптараў»

Я папрасіла старшыню ГА «Беларускі саюз дызайнераў» Дзмітрыя Сурскага падзяліцца ўражаннямі ад *Fashion Night*. Мадэлі спадара Дзмітрыя пачыналі паказ — ён аказаўся самым плённым аўтарам, прадставіўшы цэлыя дзве пары: валёнкі-панчохі і валёнкі-ласты:

— Ідэя асэнсаваць валёнкі як арт-аб'ект далёка не новая: у Расіі мастакі вельмі даўно працуюць з гэтай тэмай, існуе некалькі музеяў валёнак. Не думаю, што паказ стаў нейкім этапам у развіцці беларускага дызайну — розныя аўтары паставіліся да гэтага з гумарам, па сцёбу. Асабіста я імкнуўся прыдумаць нешта цікавае, здзівіць публіку.

На мой погляд, выпадковым атрымаўся падбор удзельнікаў На жаль, не запрасілі ніводнага скульптара — у іх маглі б быць цікавыя рашэнні. Не так шмат было і мадэльераў. Але ўсе аўтары, якія адгукнуліся на заклік Івана Айплатава, — гэта былі топ-людзі, якія прадставілі нестандартныя ідэі.

Найлепшыя валёнкі? Дайце падумаць... Найлепшыя (смяецца) — мае! Вы пагаджаецеся? (я пагадзілася — **М.М.**) Мне спадабаўся крэатыў ад Уладзіміра Цэслера: праявіўся яго мінімалізм, плакатнае мысленне. Цікавым было тое, з чаго пачынаў Іван Айплатаў. Яго абутак спайдэрмэна — гэта гібрыд валёнак і гумавых ботаў. Алена Цакаленка з «травянымі» валёнкамі была вельмі арыгінальнаю... А яшчэ мне спадабалася Бенька — яе тэатр з куфэрку — гэта нешта!

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 17 сакавіка 2007. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 288–23–52.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

**АДРАС:** 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12.
Пасведчанне №46 ад 12.01.2007 г.
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутос-Маркет». Мінск, вул. Кульман, 1.
Замова №

Падпісана да друку 22.06.2007. 8.00.
Наклад 2500 асобнікаў.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.